РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

17 СТУДЗЕНЯ 2025 г. ПЯТНІЦА № 10 (30398)

«МОТАВЕЛА ПАВІННА ЖЫЦЬ, І ГЭТА НЕПАРУШНЫ ПРЫНЦЫП»

Як знакамітае прадпрыемства атрымала другое жыццё

Фота БелТА.

Заснаваны ў 1945 годзе Мінскі мотавелазавод за сваю вялікую гісторыю бачыў многае. Прадпрыемства памятае росквіт, нездарма ж брэнды «АИСТ» і «МІНСК» вядомыя ва ўсім свеце яшчэ з савецкіх часоў. У багатай гісторыі ёсць і чорныя палосы, выхад з якіх шукалі не адзін год. Варыянтаў, што рабіць з прадпрыемствам падчас яго крызісу, было шмат. Сярод іх нават была прапанова поўнасцю знесці вытворчыя аб'екты і пабудаваць на гэтай тэрыторыі жылыя дамы. Але Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка катэгарычна гэта забараніў і заявіў, што на гэтым месцы павінна быць толькі вытворчасць. І вытворчасць высокатэхналагічная і чыстая, што надзвычай важна для сталіцы. «Трэба зрабіць узорны тэхнапарк і на яго ўзор развіваць у іншых гарадах і месцах», — такую задачу паставіў кіраўнік дзяржавы ў сакавіку 2021 года.

СТАР. 2–3

«БУДАЎНІЧАЯ АМНІСТЫЯ» Ў ДЗЕЯННІ 7

ЧАМУ БЕЛАРУСАМ У ПОЛЬШЧЫ НЕБЯСПЕЧНА 13

Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

ISSN 1990 — 763X

КАБ НІХТО НЕ САПСАВАЎ СВЯТА

26 студзеня 2025 ВЫБАРЫ ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Як будзе ажыццяўляцца бяспека падчас выбараў

Ужо праз некалькі дзён у нашай краіне пачнецца галоўны этап электаральнай кампаніі — галасаванне. Для беларусаў выбары Прэзідэнта краіны заўсёды асацыюцца з сапраўдным святам. Тым не менш не варта забываць пра бяспеку. Як правіла, традыцыйна падчас датэрміновага галасавання сілавыя структуры краіны пераходзяць на ўзмоцнены варыянт нясення службы. Гэта робіцца для таго, каб забяспечыць бяспеку не толькі грамадзян, якія прыйдуць галасаваць, але і саміх членаў выбарчых камісій, для таго, каб выбары прайшлі без усялякіх здарэнняў і парушэнняў. Якія меры будуць прымаць праваахоўнікі і ратавальнікі, каб падчас галасавання не было непрыемных неспадзяванак, расказалі на прэс-канферэнцыі ў Нацыянальным прэс-цэнтры.

СІСТЭМЫ ВІДЭАНАЗІРАННЯ, ТРЫВОЖНЫЯ КНОПКІ, ІМГНЕННАЕ РЭАГАВАННЕ

«У мэтах выканання задач па забеспячэнні бяспекі ў перыяд электаральнай кампаніі Міністэрствам унутраных спраў наладжана ўзаемадзеянне з выбарчымі камісіямі, выканкамамі і іншымі зацікаўленымі, – адзначыў **начальнік галоўнага ўпраўлення аховы правапарадку і прафілактыкі міліцыі грамадскай бяспекі Міністэрства ўнутраных спраў Аляксандр КУПЧЭНЯ**. – З асабовым складам праведзены заняткі аб асаблівасцях заканадаўства аб выбарах. Акрамя таго, праведзены неабходныя камандна-штабныя вучэнні і трэніроўкі. Арганізавана прыняцце дадатковых мер па абследаванні і абсталяванні памяшканняў участковых камісій сістэмамі відэаназірання і трывожнымі кнопкамі. Да пачатку датэрміновага галасавання ўсе аб'екты будуць абсталяваны ўсім неабходным».

СТАР. 11

«МОТАВЕЛА ПАВІННА ЖЫЦЬ,

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У той жа год у сталіцы прыступілі да стварэння сучаснага вытворчага комплексу. Мінскаму гарадскому тэхнапарку быў перададзены зямельны ўчастак на Партызанскім праспекце плошчай 27,6 га, на якім размяшчалася 60 асобна стаячых будынкаў і збудаванняў агульнай плошчай 160 тысяч кв. м. З іх выкарыстоўвалася толькі каля 60 %. Зношанасць будынкаў і інжынерных сетак складала ад 40 % да 100 %. У жніўні 2022 года Аляксандр Лукашэнка асабіста праверыў, як ідзе праца над стварэннем тэхнапарка. Тады ён патрабаваў будаваць па-сучаснаму, якасна і хутка.

У 2025 годзе можна сцвярджаць, што задача выканана. Сёння на гэтай пляцоўцы дзейнічаюць 68 арандатараў і 26 рэзідэнтаў тэхнапарка, яны займаюць плошчу ў 79,9 тысячы квадратных метраў. Сёлета прадпрыемствам будзе прадстаўлена для размяшчэння плошча яшчэ ў 126 тысяч квадратных метраў.

Рэканструкцыя ідзе, і фінансаванне не завершана. Поўная акупнасць затрат на рэканструкцыю чакаецца ў 2031 годзе. А пасля поўнага завяршэння работ плануецца размясціць на Партызанскім праспекце 140 прадпрыемстваў, у тым ліку 40 рэзідэнтаў Мінскага гарадскога тэхнапарка з гадавым аб'ёмам вытворчасці каля 300 мільёнаў рублёў. Паколькі гэта тэма была на пастаянным кантролі кіраўніка дзяржавы, з дзейнасцю Мінскага гарадскога тэхнапарка Прэзідэнт азнаёміўся асабіста.

«Лакалізацыя для нас — найважнейшае пытанне»

Старшыня Мінгарвыканкама Уладзімір Кухараў далажыў аб рэканструкцыі пляцоўкі тэхнапарка, аб яго перспектывах. Найперш кіраўнік дзяржавы пацікавіўся, якія яшчэ праблемы не вырашаны, што насцярожвае. Але старшыня Камітэта дзяржкантролю Васіль Герасімаў запэўніў, што ўсё ідзе па плане, хіба што застаюцца пытанні па лакалізацыі. «Лакалізацыя для нас — найважнейшае пытанне. Гэта не проста іміджавы праект. Мы трактары рабілі ў савецкія гады, аўтамабілі (МАЗы), веласіпеды, матацыклы — так, імідж. Але ў чым сутнасць гэтай праблемы? Мы спыніліся на тым, што трэба развіваць свае школы. **Тое, што нам дасталася ад тых пакаленняў, трэба не толькі захаваць — трэба развіваць і мадэрнізаваць.** «МотаВелаЗавод» у гэты спіс трапіў. Нам трэба развіваць тое, што мы ўмеем рабіць і што ўжо зроблена», — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка. Па яго словах, у Беларусі «пайшлі ад зямлі» і сталі развіваць тыя школы, якія ў нас былі і прадукцыя якіх сапраўды патрэбна краіне, напрыклад, трактары, веласіпеды, матацыклы і іншае. Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу: беларусы могуць зрабіць што заўгодна, нават касмічную ракету. Але, па-першае, гэта дорага. А, па-другое, ці сапраўды яны патрэбны краіне?

Увазе кіраўніка дзяржавы прадставілі ўзоры прадукцыі некаторых прадпрыемстваў — рэзідэнтаў тэхнапарка. Яны працуюць у розных кірунках ад медыцыны да праектавання лёгкіх стальных канструкцый. Самае важнае, што гэта імпартазамяшчальная прадукцыя запатрабавана ў Беларусі і мае добры экспартны патэнцыял. «Вось такія вытворчасці трэба ствараць. І я не выключаю, а гэта дакладна будзе з сусветнага вопыту, што мы паступова будзем пашыраць гэтыя вытворчасці», — адзначыў Прэзідэнт.

Асаблівую ўвагу беларускі лідар удзяліў прадукцыі ТАА «МотаВелаЗавод». Дырэктар прадпрыемства Сяргей Манько расказаў, што беларуская мота- і велапрадукцыя карыстаецца вялікім попытам як унутры краіны, так і на замежных рынках. «Ну вось. А гаварылі, нам не трэба ні веласіпеды, ні матацыклы. **Аказваецца, нам усё трэба. Веласіпед і матацыкл — гэта будучыня»,** — падкрэсліў Прэзідэнт. Ён пацікавіўся, як на прадпрыемстве рэалізоўваецца палітыка імпартазамяшчэння. Дырэктар адказаў, што да вытворчасці падключаны і іншыя прадпрыемствы сістэмы Міністэрства прамысловасці, і прыватныя кампаніі. Па асобных мадэлях узровень лакалізацыі дасягае 80 %. «Гэта добра зрабілі, што задзейнічалі, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Але каб не спыняліся».

«Для нас важна, каб вы развіваліся»

Кіраўнік дзяржавы асабіста азнаёміўся з работай некаторых прадпрыемстваў — рэзідэнтаў Мінскага гарадскога тэхнапарка. Па дарозе да іх з чыноўнікамі паспелі пагаварыць пра найважнейшыя пытанні. Напрыклад, пра другую атамную электрастанцыю. Як заўважыў Прэзідэнт, ён усё больш схіляецца да яе будаўніцтва, паколькі запатрабаванасць у электраэнергіі толькі расце. Не пакінулі без увагі і пяцігодку якасці, і Год добраўпарадкавання. Тут задачы нязменныя — навесці парадак там, дзе гэта неабходна.

Першым Аляксандр Лукашэнка наведаў прыватнае ўнітарнае прадпрыемства «Глобалхарчсэрвіс», якое з'яўляецца распрацоўшчыкам і вытворцам абсталявання

«СЁННЯ НЕ СЛОВЫ ПАТРЭБНЫ. СЁННЯ ПАТРЭБНЫ СПРАВЫ»

Па традыцыі наведвання прадпрыемстваў, кіраўнік дзяржавы паразмаўляў з калектывам. «Вельмі рады, што, напэўна, не дарма мы задумалі гэту бітву, пачынаючы з аднаўлення Мотавелазавода і заканчваючы тым, што тут ужо 140 кампаній будуць працаваць і вырабляць патрэбную тэхніку», — прывітаў Прэзідэнт супрацоўнікаў Мотавелазавода і работнікаў прадпрыемстваў — рэзідэнтаў тэхнапарка.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што некалі з аб'ектам на Партызанскім праспекце была цэлая эпапея. Спачатку прыватызацыя, маўляў «прыватнік прыйдзе — выратуе». Кіраўнік дзяржавы ўспомніў, што на гэту пляцоўку «паклалі вока» асобныя дзеячы, якія хацелі аднавіць вытворчасць, але ўмовы выконваць не збіраліся.

Потым кіраўніцтву краіны прапанавалі знесці Мотавелазавод і пабудаваць на гэтай тэрыторыі жыллё — месца вельмі зручнае, недалёка ад цэнтра Мінска. «Прасцей за ўсё жыллё, адзін рубель узяў, 20 потым атрымаеш, прадасі даражэй. Рынак жа, бескантрольна ўсё. Калі мы спрабавалі дзесьці нешта кантраляваць, то нас пачыналі душыць: амерыканцы, Захад, нават расіяне. Чаму душылі? «У вас не рыначная эканоміка», то-бок няма свабоды «што хачу, тое і раблю». Калі дзяржава пачынае рэгуляваць нешта — «не рыначная эканоміка», значыць, вам крэдытаў няма або пад вялікія працэнты, вашу прадукцыю купляць не будзем і гэтак далей... Мне гэта прыйшлося прайсці, але мы не адмовіліся ад вытворчасці. Гэта было маё першае патрабаванне. Мы будзем дапамагаць усім, хто працуе на краіну, але перш за ўсё вытворцам», — працягнуў успамінаць гісторыю гэтага месца кіраўнік дзяржавы.

У выніку Мінскаму гарвыканкаму было даручана аднавіць гэту пляцоўку. «Мотавела павінна жыць, і гэта непарушны прынцып.

«Мотавела, МАЗ, БелАЗ і іншыя прадпрыемствы — гэта брэнды нашай краіны. За гэтым стаіць вялізная колькасць людзей, гэта школы, гэта кампетэнцыі, гэта вы. Калі Мотавела не будзе — загіне школа», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Паводле яго слоў, страціць такую моцную школу нам зусім не трэба, да таго ж людзям абсалютна дакладна патрэбны матацыклы і веласіпеды.

Цяпер на тэрыторыі Мотавелазавода не толькі мадэрнізуюцца старыя карпусы, але і будуюцца новыя, за што Прэзідэнт падзякаваў кіраўніцтву Мінска. «Пакуль усё ідзе так, як дамовіліся. Чыста. А дзе пабудаваць жыллё, мы дамовімся», — адзначыў беларускі лідар. Ён расказаў, што ў краіне будзе ўзводзіцца арэнднае жыллё для работнікаў прадпрыемстваў. «Дырэктару — квадратныя метры, калі ласка, наймай людзей, няхай працуюць усе, хто хоча», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

«Мы павінны да іх па-людску паставіцца»

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў размове з кіраўніцтвам тэхнапарка абмяркоўвалася тэма працоўнай міграцыі. Абмеркаванне гэтага пытання працягнулася ў размове з калектывам. «Насцярожвае тое, што з Расіі хлынула неарганізаваная міграцыя, перш за ўсё з цэнтральнаазіяцкіх рэспублік. А што гэта за людзі? Мы іх ведаем?» — падзяліўся клопатамі Прэзідэнт. Паводле яго слоў, кіраўнікі, запрашаючы на працу мігрантаў, павінны ведаць, што гэта за людзі, і быць упэўненымі, што яны патрэбны на прадпрыемстве. «Не

Фота БелТА.

ўмеюць — навучы. Але ты за гэтых 10—20 чалавек павінен галавой адказваць. Мы павінны да іх па-людску паставіцца. Яны такія ж людзі, як мы, але яны бягуць ад бяды. Яны ўжо пакаштавалі гэтага жыцця, і яны заўсёды добра працуюць, калі да іх па-чалавечы», — арыентуе беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ў грамадзян іншых краін у Беларусі будзе доступ і да адукацыі, і да медыцыны. Усё будзе як у нас. Асабліва, звярнуў увагу Прэзідэнт, для ўкраінцаў. «Вельмі шмат украінцаў сёння едуць да нас. Мы павінны прымаць іх як сваіх людзей. Тыя людзі, якія да нас прыехалі з Украіны, я не чуў, каб нехта сказаў, што яны дрэнна працуюць. Гэта добрыя людзі», — сказаў беларускі лідар. Паводле яго слоў, у найбліжэйшы час гэтыя пытанні будуць разгледжаны на самым высокім узроўні.

«Пакуль пажар не палае ў Беларусі, гэтым пытаннем трэба займацца. Тым больш нам людзі патрэбны. Але кожнага чалавека трэба глядзець», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

«Менш жалеза — больш мазгоў»

Вяртаючыся да размовы аб Мотавела і тэхнапарку, Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што справы тут ідуць нядрэнна. Ён назваў кірунак, па якім хацеў бы атрымаць эфект, — маштабы прадпрыемства. «Трэба маштабаваць гэтыя вытворчасці. Пачынаць трэба з малога, а далей будзем дапамагаць, няхай развіваецца», — падкрэсліў беларускі лідар. Гэта датычыцца як дзяржаўных, так і прыватных прадпрыемстваў, рэзідэнтаў Мінскага гарадскога тэхнапарка. «І мы гэтым прыватнікам будзем дапамагаць. Ніякай настроенасці ў Беларусі няма і не будзе супраць прыватнай вытворчасці, тых, хто плаціць падаткі, плаціць нармальную зарплату, прадае прадукцыю», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Гаворачы аб пляцоўцы Мотавела, Прэзідэнт падкрэсліў: «Тое, што я хацеў атрымаць ад гэтай пляцоўкі, у 2025 годзе, адчуваю, мы атрымаем. І адсюль будзем развіваць свае вытворчасці. А вам вялікі дзякуй, вы малайцы». Аляксандр Лукашэнка расказаў аб планах у найбліжэйшую пяцігодку пабудаваць у Мінску яшчэ пяць такіх тэхнапаркаў. Адной з пляцовак стане завод «Гарызонт», дзе будуць ствараць высокатэхналагічныя вытворчасці. Як заўважыў Прэзідэнт, «менш жалеза — больш мазгоў».

«Па жыллі я сказаў, як будзем развівацца. Па зарплаце — што заробіце, тое ваша. Вытворчасць як будзем развіваць, я сказаў. Што датычыцца гандлю, шмат чулі: формула справядлівасці. Ніхто людзей не павінен абдзіраць, набіваць кішэні і вывозіць за межы краіны», — дадаў беларускі лідар.

«Мы ўсё можам зрабіць, галоўнае — прадаць»

Для развіцця Мотавелазавода дзяржавай у апошнія гады зроблена вельмі шмат. Гэта прадпрыемства пастаянна знаходзіцца пад увагай Прэзідэнта. Ён неаднаразова адзначаў, што гэта брэнд краіны, які неабходна захаваць. Сёлета знакамітыя маркі «МІНСК» і «АИСТ», вядомыя далёка за межамі нашай краіны, адзначаюць сваё 80-годдзе. У 2024 годзе ўведзены ў эксплуатацыю цэх металаканструкцый, зборачны цэх, складскі комплекс. З ліпеня пачаў працаваць новы цэх афарбоўкі. Па выніках 11 месяцаў 2024 года прадпрыемства спрацавала з чыстым прыбыткам, забяспечваючы прырост заработнай платы. Доля экспарту ў агульным аб'ёме рэалізацыі перасягнула 35 працэнтаў. Праведзена работа па павышэнні ўзроўню лакалізацыі вытворчасці. У мінулым годзе на магутнасцях прадпрыемства зманціраваны і запушчаны ўчастак па тэсціраванню і зборцы літыевых акумулятарных батарэй — ёсць планы па распрацоўцы і выпуску электратранспарту. Адзін з супрацоўнікаў прадпрыемства спытаў у Прэзідэнта, ці магчыма атрымаць дзяржзаказ на такую прадукцыю для забеспячэння электравеласіпедамі і матацыкламі медыкаў, міліцыі, ваенных і іншых службаў, асабліва ў сельскай мясцовасці. «Усё, што трэба, я вам зрабіў. Далей — выраблайце і прадавайце», — адказаў Прэзідэнт. Ён падкрэсліў, што беларусы могуць выраблць усё, нават касмічную ракету. Але галоўнае пытанне — час і грошы. А лішніх грошай няма. Таму, заўважыў

І ГЭТА НЕПАРУШНЫ ПРЫНЦЫП»

Фота БелТА.

для перапрацоўкі алейных культур. Прадукцыя пастаўляецца ў Расійскую Федэрацыю і на знешнія рынкі, дзе карыстаецца попытам. Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што прыватным кампаніям таксама вельмі важна не гнацца за імпартнымі камплектуючымі і дэталямі, а найперш купляць сваё. Гэта задача ў тым ліку і для Мінпрама. «Калі патрэбна будзе дапамога, вы гаварыце. Для нас важна, каб вы развіваліся», — сказаў кіраўнік дзяржавы кіраўніку «Глобалхарчсэрвісу» Сяргею Сільчанку.

Сусед гэтага прадпрыемства (вытворчасці размяшчаюцца ў адным цэху) — «СтратНанаТэкІнвест». Гэтая арганізацыя займаецца распрацоўкай тэхналогій танкаплёначных пакрыццяў і вытворчасцю вакуумнага тэхналагічнага абсталявання для нанясення такіх пакрыццяў. Новы кірунак — апрацоўка дэталяў для машынабудавання. 100 % прадукцыі — інавацыйная. На прадпрыемстве працуе 55 чалавек. Прэзідэнт спытаў у генеральнага дырэктара Айрата Хісамава, ці плануюць яны пашырацца. Той адказаў, што такія планы ёсць.

Паглядзеў кіраўнік дзяржавы і як працуе прадпрыемства «ЕўраСтройСтандарт». Асноўны кірунак яго дзейнасці — праектаванне лёгкіх стальных танкасценных канструкцый. Тут Аляксандр Лукашэнка таксама звярнуў пільную ўвагу на лакалізацыю. Прадукцыя гэтага прадпрыемства запатрабавана ў будаўніцтве аб'ектаў аховы здароўя, сельскай гаспадаркі, прамысловасці, гандлі і іншых сферах, дзе патрэбны камфортныя, зручныя будынкі.

Аляксандр Лукашэнка завітаў і ў цэхі ўласна Мотавелазавода. Ён прайшоў праз цэхі фарбы, зборкі і рамакамплектаў. Дзякуючы рашэнням Прэзідэнта, вытворчасць на знакамітым прадпрыемстве атрымала другое дыханне. Шмат чаго зроблена для пашырэння асартыменту і лакалізацыі прадукцыі. Кіраўнік дзяржавы актыўна цікавіўся работай вытворчасці. І не толькі дакладамі кіраўніцтва, але і меркаваннямі рабочых, на звычайны ход працоўнага дня якіх візіт Прэзідэнта аніяк не паўплываў. Як заўважыў кіраўнік дзяржавы, тут працуюць зусім маладыя людзі. Дырэктар Мотавела ўдакладніў, што сярэдні ўзрост работнікаў — 41 год, расказаў пра тое, што ўсім іншагароднім даецца інтэрнат. «Усіх трэба перавесці на арэнднае жыллё», — такую задачу кіраўнік дзяржавы паставіў кіраўніку завода. Аляксандр Лукашэнка зайшоў і ў памяшканне, дзе работнікі могуць адпачыць і падсілкавацца. Старшыня Мінгарвыканкама Уладзімір Кухараў паведаміў, што ў Мінскім гарадскім тэхнапарку ў хуткім часе з'явіцца сталовая. Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што вакол тэхнапарка фарміруецца сацыяльная сфера, куды адносяцца інтэрнаты, арэнднае жыллё. Ён зрабіў акцэнт на тым, што цэны на гэта павінны быць даступныя. «Да людзей трэба ставіцца добра», — такое агульнае патрабаванне беларускага лідара.

«ТРЭБА РАЗВІВАЦЦА, ЗМАГАЦЦА»

Магчымасць задаць пытанні кіраўніку дзяржавы не ўпусцілі і журналісты. І першае пытанне, канешне, пра электаральную кампанію. Журналісты заўважылі, што Аляксандр Лукашэнка не выступае праграмна, не ўдзельнічае ў дэбатах, а працуе ў звыклым рэжыме. А кіраўнік дзяржавы прызнаўся, што нават не сочыць за ходам выбарчай кампаніі — няма часу.

«Ведаю, што ідуць дэбаты. Але ніводных дэбатаў я не бачыў. Цяпер не да дэбатаў. Ды і што дэбаты — каб людзі разабраліся. Разбірайцеся. Сёння не словы патрэбны. Сёння патрэбны справы. І Беларусь ніколі не будзе Беларуссю 1990-х гадоў, калі мяне маладога выбіралі Прэзідэнтам. Тады мы не маглі марыць аб гэтых «палацах» — аб вытворчасці і іншым. Тады трэба было выжываць. А цяпер трэба развівацца, змагацца, таму не словы патрэбны, а справы», — падкрэсліў Прэзідэнт. Ён праанансаваў хуткае адкрыццё новай вытворчасці аўтобусаў. «Попыт каласальны на нашы аўтобусы. Мы пабудавалі за паўтара-два гады гэты завод. Таму патрэбны справы. Я гэта ведаю больш, чым хто-небудзь. Таму працягваю займацца сваімі справамі», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Ён расказаў, што ў яго шмат «запазычанасцяў» у выглядзе мерапрыемстваў, прысвечаных вытворчай тэматыцы. А наступіць вясна, і трэба будзе займацца сельскай гаспадаркай.

«Хлеб трэба будзе сеяць. Нікуды мы не дзенемся. З гэтым Прэзідэнтам, з другім — вам хлеб давядзецца сеяць. Таму што без хлеба нікуды», — заўважыў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт адзначыў, што электаральная кампанія ў краіне праходзіць спакойна і гэта нармальна. Шоу нам не патрэбна. Аляксандр Лукашэнка заклікаў усіх грамадзян вызначыцца і ў дзень выбараў аддаць свой голас за кандыдата, які найбольш ім імпануе. Тым больш што часу для гэтага дастаткова, з 21 студзеня пачынаецца датэрміновае галасаванне. «Вы людзі вопытныя, разумныя. Думайце. Я ніколі не казаў пра выбары, не заклікаў вас да чагосьці. Прыйдзіце прагаласуйце — цэлы тыдзень. Знойдзеце час — прагаласуйце. Ну, не захочаце — мы ж вас на вяроўцы цягнуць не будзем», — дадаў беларускі лідар.

Журналісты заўважылі, што польскія ўлады актыўна рэагуюць на выбары ў Беларусі — ужо назвалі гэтую кампанію махлярствам, адмаўляюцца адкрываць пункты пропуску, бо яны не бачаць крокаў ад беларусаў, і ўсюды прыцягваецца тэма Пачобута. У Аляксандра Лукашэнкі пацікавіліся, чаму палякам няймецца. «Што датычыцца Пачобута, нават казаць няма чаго. Я вам шчыра гавару як чалавек, які інфармаваны: яны адмовіліся ад Пачобута. Палякі адмовіліся весці нават размовы па Пачобуту. Наколькі мяне інфармуюць, Пачобут не хоча туды ехаць. Вось і ўсё пытанне, — адказаў Аляксандр Лукашэнка. — Анджэй Пачобут — беларускі грамадзянін, і за ўчыненыя злачынствы ён адказаў па законе. Далей будзем глядзець. Паверце, на Пачобуце свет не сышоўся».

Што датычыцца пункта пропуску, то, па словах кіраўніка дзяржавы, палякі могуць хоць усе закрыць, беларусы туды не ездзяць, нічога не возяць. «Што, Мотавелазавод возіць туды прадаваць прадукцыю? Не. Яны ж санкцыі супраць нас увялі. Увялі — добра. Ну, мы і не змагаемся супраць той міграцыі і людзей, якія там хочуць жыць і якія туды ідуць. Я ўжо тысячу разоў пра гэта казаў: з пятлёй на шыі я не буду іх абараняць», — адзначыў Прэзідэнт.

Каментуючы заявы аб «махлярстве», Аляксандр Лукашэнка параіў польскім уладам разабрацца з сітуацыяй у сваёй краіне. Ён звярнуў увагу, што ў маі прэзідэнцкія выбары ў Польшчы, вось улады і спрабуюць пераключыць увагу на Беларусь, каб не адказваць перад сваім народам.

Прэзідэнт падкрэсліў, што збеглыя працягваюць абмяркоўваць планы ўзброенага нападу на Беларусь з тэрыторыі Украіны або Польшчы. «Ды калі ласка, паспрабуйце. Потым не крыўдуйце. Мы бачым, што яны рыхтуюць там атрады і іншае. Даўно бачым. Але яны няхай не думаюць, што гэтыя атрады супраць Беларусі будуць ваяваць. Яны на тэрыторыі Польшчы, і зброю яны яшчэ могуць выкарыстаць супраць палякаў.

«Літоўцы «наеліся» беларусаў: там жа нацыяналісты нашы прыехалі (дзякуй ім) і пачалі разважаць, што Вільня і іншае — гэта беларускія гарады».

Палякі ўжо не ведаюць, што з нашымі збеглымі «літоўцамі» рабіць», — сказаў ён.

«Жыццё ідзе, развіваецца. Нам не трэба асабліва перажываць за палякаў і за ўсё, што ў іх адбываецца. Гэта звычайная балбатня. Гэта скокі пад амерыканцаў. Амерыканцы цяпер, каб знішчыць Еўропу (а гэта іх мэта, пры Трампе, паглядзіце, гэта ўзмоцніцца), выкарыстоўваюць палякаў. Будзе як з Украінай. Не дай бог, канешне», — падсумаваў Аляксандр Лукашэнка.

«Гэта — роднае дзіця»

На памяць аб наведванні Мінскага гарадскога тэхнапарка і ў знак падзякі за клопат аб Мотавелазаводзе Прэзідэнту падарылі матацыкл маркі «Мінск Д4 125». Гэта першы матацыкл, выраблены на новых мадэрнізаваных лініях прадпрыемства.

«Усе падарункі аддаю дзяржаве, але матацыкл не аддам. Прынамсі да вясны. Вясной сфатаграфуюся спецыяльна, «Пул Першага» выкладзе гэта ўсё. ...Беларускі матацыкл. Хоць у мяне ёсць і іншыя матацыклы, але гэты — роднае дзіця, таму я вам вельмі ўдзячны», — з гумарам падзякаваў Аляксандр Лукашэнка.

Валерыя СЦЯЦКО.

Аляксандр Лукашэнка, запускаючы вытворчасць нейкай прадукцыі, трэба задаваць пытанне — ці сапраўды гэта трэба? Прэзідэнт упэўнены, што дбаць аб рэалізацыі прадукцыі павінна найперш само прадпрыемства.

«Ім не сцерці подзвіг нашага народа»

У Прэзідэнта спыталі яго меркаванне аб тым, што ў Кіеве каля манумента «Радзіма-маці» на Алеі гарадоў-герояў дэманціравалі надпісы «Мінск» і «Масква», а таксама пяціканцовыя зоркі гарадоў-герояў. «Калі б вы не сказалі, я нават і не ведаў, — адказаў на гэта Аляксандр Лукашэнка. — Калі ім зручна — няхай сціраюць. Ім не сцерці подзвіг нашага народа». Па яго словах, у Беларусі ў 1990-я таксама былі падобныя тэндэнцыі. Але наша краіна такім шляхам не пайшла. І ў гэтым выйграла. Беларускі лідар адзначыў, што даўно ведае прэзідэнта Украіны Уладзіміра Зяленскага. «Мне здавалася, што гэта нармальны, разумны чалавек. Але бачыце, як паступіў. Вось і атрымалася», — сказаў ён. Па словах Аляксандра Лукашэнкі, усё, што адбылося ва Украіне, — ад улады: «Усё пачыналася адтуль, цябе падштурхоўвалі да гэтага. Ну чаму ты не падумаў, што гэта шкодна для твайго народа? Ну іншыя былі інтарэсы. Гэта іх справа».

«Вы ўжо не будзеце крычаць, што мы «лапатнікі»

У працяг тэмы гістарычнай памяці згадалі выстаўку дасягненняў суверэннай Беларусі «Мая Беларусь», якая разгарнулася ў Мінскім міжнародным выставачным цэнтры. У Прэзідэнта спыталі, ці будзе працяг у гэтага праекта. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што дадзеная экспазіцыя — гэта яшчэ не поўны выставачны праект. Поўнасцю ён будзе адкрыты вясной, да Дня Перамогі. Ідэя была ў тым, каб адкрыць першы этап праекта, паказаць яго людзям. Асабліва, па словах беларускага лідара, важна, каб выстаўку ўбачылі дзеці і моладзь.

«Мы будзем развіваць гэты сектар — выставачны, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Добра, што вы гэта ўбачылі. Вы ўжо не будзеце крычаць, што мы «лапатнікі». Вы будзеце разумець, што і вось гэта мы можам зрабіць сваімі рукамі. У гэтым была задума».

Выставачная дзейнасць, якая адлюстроўвае гісторыю і дасягненні Беларусі, працягнецца і ў Нацыянальным гістарычным музеі, які будзе пабудаваны каля Палаца Незалежнасці. Па словах Аляксандра Лукашэнкі, вельмі важна, каб моладзь бачыла, адкуль наша краіна пайшла. І падаваць гэтую інфармацыю трэба яркa, незвычайна, па аналогіі з выстаўкай «Мая Беларусь», якая карыстаецца вялікай папулярнасцю. «Гэта будзе маштабны музей, дзе вы ўбачыце, што вакол нас нічога не было, акрамя лясоў. Нашы людзі сваю дзяржаўнасць пачалі развіваць тут. Тураўскае, Полацкае княствы... Вось мы пакажам, што мы не «лапатнікі», што мы не Іваны, якія не помняць роду свайго, што мы — людзі з глыбокай гісторыяй», — падкрэсліў Прэзідэнт. Па яго словах, галоўная мэта гэтага праекта — зрабіць так, каб кожны наведвальнік экспазіцыі ганарыўся тым, што жыве ў гэтай краіне.

ГРАМАДЗЯНЕ ЎПЭЎНЕНА ГЛЯДЗЯЦЬ

Згодна з сацдаследаваннем, удзел у выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

Беларусы дэманструюць электаральную актыўнасць: апытанне Цэнтра сацыяльна-гуманітарных даследаванняў Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта пацвярджае, што абсалютная большасць жыхароў нашай краіны збіраецца пайсці на выбары, падтрымлівае палітыку, якую праводзіць дзеючы кіраўнік дзяржавы, і з аптымізмам глядзіць у будучыню. Атрыманыя даныя сацыялагічнага даследавання, якое праводзілася ў снежні 2024 года, прадставіла кіраўнік Цэнтра сацыяльна-гуманітарных даследаванняў БДЭУ Ірына ЛАШУК.

Калі б выбары прайшлі сёння,
ЗА КАГО Б ВЫ ПРАГАЛАСАВАЛІ?

У Рэспубліцы Беларусь даследаванне праводзілася Цэнтрам сацыяльна-гуманітарных даследаванняў БДЭУ метадам пакватэрнага інтэрв'ю (выбарка — 1500 рэспандэнтаў), у Сербіі — Інстытутам міжнароднай палітыкі і эканомікі (ІМПЭ) метадам тэлефоннага інтэрв'ю (выбарка — 1590 рэспандэнтаў). Даследаванні праводзіліся па падобнай методыцы, што дазваляе правесці параўнальны аналіз даных.

© Інфаграфіка

Як, на вашу думку,
ЗМЕНІЦЦА ЭКАНАМІЧНАЯ СІТУАЦЫЯ Ў КРАІНЕ ПРАЗ 5 ГАДОЎ?

У Рэспубліцы Беларусь даследаванне праводзілася Цэнтрам сацыяльна-гуманітарных даследаванняў БДЭУ метадам пакватэрнага інтэрв'ю (выбарка — 1500 рэспандэнтаў), у Сербіі — Інстытутам міжнароднай палітыкі і эканомікі (ІМПЭ) метадам тэлефоннага інтэрв'ю (выбарка — 1590 рэспандэнтаў). Даследаванні праводзіліся па падобнай методыцы, што дазваляе правесці параўнальны аналіз даных.

© Інфаграфіка

ВЫСОКАЯ ЭЛЕКТАРАЛЬНАЯ АКТЫЎНАСЦЬ

У прыватнасці, рэспандэнтам прапаноўвалася адказаць на пытанне: «Калі б выбары прайшлі сёння, за каго б вы прагаласавалі?» «За дзеючага кіраўніка дзяржавы» — так адказалі 82,5 % апытаных, «за альтэрнатыўнага кандыдата» — 2,9 %, «супраць усіх» — 7,9 %, «не буду галасаваць» — 6,7 %.

— Красамоўны факт: дзеючага кіраўніка дзяржавы гатовы падтрымаць на найбліжэйшых выбарах 82,5 % апытаных рэспандэнтаў. Адпаведна, беларускае грамадства ўпэўнена ў дзяржаўным курсе, які рэалізоўваецца, у выбудоўванні міжнародных адносін, што стварае спрыяльную аснову для развіцця стратэгічнага ўзаемадзеяння з іншымі краінамі. Знешнепалітычнай формулай беларусаў з'яўляецца значнасць культурнай агульнасці краіны-партнёра ў спалучэнні з высокім узроўнем эканомікі і развіцця гандлёвых адносін, — заявіла Ірына Лашук.

Таксама яна агучыла даныя, згодна з якімі ўдзел у выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь плануюць прыняць 85,5 % беларусаў.

Так, рэспандэнтам прапаноўвалася адказаць на пытанне: «Ці збіраецеся вы прыняць удзел у маючых адбыцца выбарах?». «Так» адказалі 85,5 % апытаных, «не» — 4,8 %. Яшчэ не вызначыліся — 9,7 %.

— Людзі збіраюцца ўдзельнічаць у выбарах, зрабіць свой усвядомлены палітычны, стратэгічны выбар. Даследаванне паказала ўстойлівасць грамадска-палітычнай абстаноўкі і з'яднанасць грамадства, — пракаментавала Ірына Лашук.

Адным са складнікаў гэтага з'яўляецца эканамічны аптымізм, які пануе ў грамадстве. Кіраўнік Цэнтра сацыяльна-гуманітарных даследаванняў БДЭУ пацвярджае гэты факт данымі, згодна з якімі больш за 73 % беларусаў лічаць, што эканамічная сітуацыя ў краіне праз пяць гадоў застанецца такой жа або стане яшчэ лепшай.

Напрыклад, рэспандэнтам прапаноўвалася адказаць на пытанне: «Як, на вашу думку, зменіцца эканамічная сітуацыя ў краіне праз пяць гадоў?». Застанецца такой жа або палепшыцца — так лічаць 73,1 % апытаных. Крыху пагоршыцца — 2,4 %, істотна пагоршыцца — 1,3 %.

— Гэта людзі, якія не вельмі валодаюць аб'ектыўнымі паказчыкамі, не вельмі імі цікавяцца. А наогул тое, што людзі не задумваюцца, як будзе развівацца эканоміка, — таксама станоўчы момант. Паколькі калі ўсё добра, то навошта пра гэта думаць? Гэта сведчыць аб адсутнасці крызісу, — дапоўніла эксперт.

Ад выбранага Прэзідэнта беларусы чакаюць стабільнага і бяспечнага жыцця, актыўнага развіцця эканомікі.

— Гэта сведчыць аб тым, што эканоміку краіны беларусы ўспрымаюць даволі стабільна. Яны ўпэўнены ў развіцці эканомікі, — адзначыла Ірына Лашук. — Аб'ектыўныя паказчыкі развіцця эканомікі з'яўляюцца пераканаўчымі для фарміравання думкі грамадзян. Яны арыентуюцца на аб'ектыўныя эканамічныя паказчыкі і робяць уласныя высновы, якія сведчаць аб упэўненасці ў заўтрашнім дні.

Не змаглі адказаць 23,2 % апытаных.

Ці збіраецеся вы прыняць удзел
У МАЮЧЫХ АДБЫЦЦА ВЫБАРАХ?

У Рэспубліцы Беларусь даследаванне праводзілася Цэнтрам сацыяльна-гуманітарных даследаванняў БДЭУ метадам пакватэрнага інтэрв'ю (выбарка — 1500 рэспандэнтаў), у Сербіі — Інстытутам міжнароднай палітыкі і эканомікі (ІМПЭ) метадам тэлефоннага інтэрв'ю (выбарка — 1590 рэспандэнтаў). Даследаванні праводзіліся па падобнай методыцы, што дазваляе правесці параўнальны аналіз даных.

© Інфаграфіка

Чаго вы чакаеце ад
ВЫБРАНАГА ПРЭЗІДЭНТА?

У Рэспубліцы Беларусь даследаванне праводзілася Цэнтрам сацыяльна-гуманітарных даследаванняў БДЭУ метадам пакватэрнага інтэрв'ю (выбарка — 1500 рэспандэнтаў), у Сербіі — Інстытутам міжнароднай палітыкі і эканомікі (ІМПЭ) метадам тэлефоннага інтэрв'ю (выбарка — 1590 рэспандэнтаў). Даследаванні праводзіліся па падобнай методыцы, што дазваляе правесці параўнальны аналіз даных.

© Інфаграфіка

Рэспандэнтам прапаноўвалася адказаць на пытанне: «Чаго вы чакаеце ад выбранага Прэзідэнта?». Стабільнага і бяспечнага жыцця — так адказалі 57,3 %, актыўнага развіцця эканомікі — 12,9 %, павышэння сацыяльных гарантый для грамадзян — 7,8 %, павышэння ролі і статусу Беларусі на міжнароднай арэне — 6,8 %, стварэння ўмоў для самарэалізацыі моладзі — 6,3 %, паляпшэння супрацоўніцтва з іншымі краінамі — 5,7 %, больш цесных адносін са славянскімі краінамі — 1,5 %, далейшага развіцця партый і грамадзянскай супольнасці — 0,7 %, іншага — 0,9 %.

— Першую пазіцыю займае стабільнае і бяспечнае жыццё. Гэта тое, чаго не хапае Еўропе. Беларусы разумеюць і ўсведамляюць каштоўнасць стабільнага і бяспечнага жыцця і чакаюць гэтага ў найбліжэйшыя пяць гадоў, — падкрэсліла эксперт.

СЕРБЫ БАЧАЦЬ У БЕЛАРУСІ СТРАТЭГІЧНАГА ПАРТНЁРА

Трэба сказаць, што ў снежні 2024 года было праведзена сустрэчнае сацдаследаванне паміж Беларуссю і Сербіяй. У Сербіі даследаванне арганізавана Інстытутам міжнароднай палітыкі і эканомікі з прыцягненнем незалежнага даследчага цэнтра House of Win. У Рэспубліцы Беларусь апытанне правёў Цэнтр сацыяльна-гуманітарных даследаванняў Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта. У Беларусі апытанне праводзілася метадам пакватэрнага інтэрв'ю (выбарка — 1500 рэспандэнтаў). Асноўная мэта — выявіць асаблівасці ўзаемнага ўспрымання беларусаў і сербаў, вызначыць найбольш перспектыўныя кірункі супрацоўніцтва і развіцця дружалюбных адносін паміж дзвюма краінамі. З улікам супадзення часу даследавання з выбарчай кампаніяй у Беларусі асобны блок пытанняў беларускай часткі даследавання датычыўся ацэнкі грамадзянамі сацыяльна-палітычнай абстаноўкі і прыярытэтных электаральных установак грамадзян.

ШТО ПАКАЗАЎ АНАЛІЗ СЕРБСКАГА БЛОКА АПЫТАНЫХ?

Галоўны вынік — санкцыйны націск Захаду не ўплывае на ўспрыманне сербамі Беларусі як стратэгічна значнага партнёра.

У БУДУЧЫНЮ

плануюць прыняць 85,5 % беларусаў

У прыватнасці, сербы лічаць найбольш перспектыўнымі кірункамі супрацоўніцтва з Беларуссю сельскую гаспадарку, прадукты харчавання, гандаль. Такія даныя сацыялагічнага даследавання агучыў старшы навуковы супрацоўнік, дырэктар Цэнтра еўразійскіх даследаванняў Інстытута міжнароднай палітыкі і эканомікі Сербіі Душан Праракавіч.

Перспектыўным у вачах сербаў бачыцца развіццё доўгатэрміновых адносін паміж Сербіяй і Беларуссю, асабліва ў сферы сельскай гаспадаркі і харчавання (51,3 %), гандлю (28,6 %) і машынабудавання (26,6 %). У рамках эканамічных адносін сербы падкрэсліваюць значнасць развіцця гандлю і больш шырокай прадстаўленасці прадукцыі абедзвюх краін на рынках Беларусі і Сербіі. У ліку найбольш вядомых беларускіх брэндаў названы лідары машынабудавання (МАЗ, МТЗ), флагманы бытавой тэхнікі («Атлант», «Гефест»), вытворцы касметычных сродкаў («Беліта») і кандытарскіх вырабаў («Камунарка»).

Характэрна, што санкцыйны ціск Захаду, які аказваецца на Беларусь, не ўплывае на ўспрыманне сербамі Беларусі як стратэгічна значнага партнёра. Прыярытэтнымі кірункамі развіцця супрацоўніцтва ў сацыяльнай сферы, на думку сербаў, выступаюць адукацыя, турызм, культура і рэлігія.

Сербы таксама лічаць неабходным развіццё супрацоўніцтва з Беларуссю ў такіх сферах, як вытворчасць (80,9 %), адукацыя і навука (78,7 %), гандлёва-эканамічная сфера (77,8 %), турызм (70,2 %), культура (67,3 %), грамадства (64,1 %), рэлігія (56,4 %), сфера фінансаў (40,1 %).

— Было вельмі цікава ўбачыць, што наша грамадства думае пра Беларусь. Для мяне самае важнае, што гэта першы крок для наступных даследаванняў. Нам трэба падумаць не толькі на палітычным, але і на навуковым узроўні, як дасягнуць прагрэсу, развіцця двухбаковых адносін з дружалюбнымі дзяржавамі. Беларусь тут — на першай лініі. І першы крок — гэта даследаванне, — расказаў Душан Праракавіч. — Наша грамадства падтрымлівае супрацоўніцтва з Рэспублікай Беларусь. Сербія можа быць акном для беларускай прадукцыі ў Еўрасаюз з-за дагавораў, якія ў нас існуюць з ЕС. А Беларусь можа быць акном для нашай вытворчасці ў ЕАЭС. Прастора для супрацоўніцтва шырокая. Можна рабіць сумесныя праекты ў эканоміцы. У Сербіі добра працуюць вашы МАЗы, БЕЛАЗы. У Сербіі ведаюць, што Беларусь — гэта аграіндустрыяльная сіла. У вас вельмі моцны аграпрамысловы комплекс. А развіццё сферы турызму дапаможа нам больш даведацца адзін пра аднаго.

КРАІНА З ВЫСОКІМ ЧАЛАВЕЧЫМ КАПІТАЛАМ

Таксама ў рэспандэнтаў пацікавіліся: якія перавагі Беларусі ствараюць аснову для ўзаемадзеяння з Сербіяй і іншымі славянскімі краінамі? Беларусь — краіна з высокім чалавечым патэнцыялам — так адказалі 43,5 % апытаных, Беларусь — экалагічна чыстая краіна — 41,5 %, Беларусь — аграрная краіна з сельскай культурай — 35,5 %, Беларусь — надзейны саюзнік і партнёр на міжнароднай арэне — 31 %, Беларусь — мост паміж цывілізацыямі, Захадам і Усходам — 29,8 %, Беларусь — міжнародная перагаворная пляцоўка — 22,5 %, Беларусь — донар міру і стабільнасці ў рэгіёне — 21,9 %, Беларусь — дзяржава сацыяльнай справядлівасці — 21,1 %.

— У час даследавання мы замяралі пазіцыю беларусаў у адносінах не толькі да сербаў, але і да сябе. І тут выявіліся некаторыя адрозненні.

«Калі сербы гавораць, што Беларусь — больш аграпрамысловая краіна, то самі беларусы лічаць, што гэта краіна з высокім чалавечым патэнцыялам. Гэта вельмі добрая пазіцыя, якая знаходзіцца на першым месцы. Другая па значнасці пазіцыя — экалагічна чыстая краіна. І далей ужо ідзе сельскагаспадарчая вытворчасць як важны складнік краіны. Гэтыя даныя сведчаць аб тым, што мы сябе ўспрымаем больш глыбінна», — адзначыла Ірына Лашук.

Яшчэ адно пытанне, што ў час даследавання было зададзена беларусам і сербам: «У якіх сферах неабходна развіваць супрацоўніцтва Беларусі і Сербіі?»

— І падобныя атрымаліся вынікі, што таксама сведчыць аб нашых агульных інтарэсах. Гэта ў першую чаргу вытворчасць, адукацыя і навука, гандлёва-эканамічная і турыстычная сферы, што вельмі актуальна ва ўмовах санкцый. Турызм развіваецца ў бок дружалюбных нам краін, гэта лагічна. І мы маем тут вельмі сур'ёзныя рэсурсы адзін для аднаго, — падкрэсліла эксперт.

Яна лічыць, што гэта параўнальнае даследаванне — першы крок у навуковым асэнсаванні масавай свядомасці беларусаў і сербаў.

— І далей у гэтым кірунку трэба развівацца, тут ёсць вялікія перспектывы, — адзначыла Ірына Лашук.

Развіццё адносін з дружалюбнымі дзяржавамі патрабуе пастаяннага ўліку грамадскай думкі і запатрабаванняў. Адзін са спосабаў — правядзенне сустрэчных даследаванняў: два сацыялагічныя цэнтры адначасова арганізуюць кожны ў сябе ў краіне рэпрэзентатыўнае апытанне па падобнай метадалогіі і папярэдне ўзгодненым інструментарыі (анкеце).

Па матэрыялах БелТА.

Ці лічыце вы неабходным развіваць супрацоўніцтва з Рэспублікай Беларусь У НАСТУПНЫХ СФЕРАХ ЖЫЦЦЯ?

У Рэспубліцы Беларусь даследаванне праводзілася Цэнтрам сацыяльна-гуманітарных даследаванняў БДЭУ метадам пакватэрнага інтэрв'ю (выбарка — 1500 рэспандэнтаў), у Сербіі — Інстытутам міжнароднай палітыкі і эканомікі (ІМПЭ) метадам тэлефоннага інтэрв'ю (выбарка — 1590 рэспандэнтаў). Даследаванні праводзіліся па падобнай методыцы, што дазваляе правесці параўнальны аналіз даных.

© Інфаграфіка БЕЛТА

МЕРКАВАННІ

«ЛЮДЗІ НЕ ПРОСТА НАСТРОЕНЫ ЎДЗЕЛЬНІЧАЦЬ У ВЫБАРАХ — ЯНЫ ВЫБАРЫ ЧАКАЮЦЬ»

Парламентарыі — аб высокай электаральнай актыўнасці беларусаў

Аляксандр БАГЕЛЬ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні, дырэктар ААТ «Світанак» імя К. П. Арлоўскага»:

— Ад кожнага з нас залежыць, як мы будзем жыць у будучыні, і людзі гэта разумеюць. Радуе, што нашы людзі салідарныя ў гэтых думках. На іх вачах за 30 гадоў адбыўся імклівы рух наперад. Мы будуем дарогі, жыллё, сучасныя аўтаматызаваныя фермы, асвойваем перадавыя тэхналогіі і робім свае адкрыцці. І не збіраемся прыпыняцца на дасягнутым.

Не сумняваюся, што народ зробіць правільны выбар. Падчас сустрэч з людзьмі я часта чую словы падзякі ў адрас кіраўніцтва дзяржавы за стабільнасць, мір, устойлівае развіццё эканомікі. Беларусы задаволены якасцю свайго жыцця, разумеюць усю крохкасць гэтага свету, занепакоеныя тымі падзеямі, якія адбываюцца вакол краіны. Яны хочуць, каб іх дзеці і ўнукі жылі ў квітнеючай краіне. Сельская гаспадарка, дзе я доўгі час працую, пастаянна адчувае на сабе дапамогу з боку дзяржавы. Перакананы, што так будзе і ў далейшым. І наш аграпрамысловы комплекс гатовы і надалей рабіць унёсак у харчовую бяспеку нашай краіны.

Ад нас залежыць, як мы будзем жыць далей. Трэба самаадданна працаваць, выхоўваць дзяцей, не забываць нашых гераічных продкаў. Нашчадкі пераможцаў павінны з гонарам несці гэта званне. Наша моц у адзінстве, справядлівасці і перакананасці ў тым, што мы знаходзімся на адзіна правільным шляху развіцця краіны.

Ірына ДАЎГАЛА, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Палаты прадстаўнікоў:

— Сёння наўрад ці знойдзецца чалавек у нашай краіне, які не ведаў бы пра тое, што ў нас ідзе самая важная палітычная электаральная кампанія — выбары Прэзідэнта Беларусі. Вядома ж, акрамя інфармацыйнага забеспячэння ўсімі відамі сродкаў масавай інфармацыі, інтэрнэт-рэсурсамі, сацыяльнымі сеткамі, ідуць сустрэчы ў працоўных калектывах, з насельніцтвам па месцы жыхарства дэпутатамі ўсіх узроўняў, прадстаўнікамі дзяржаўных органаў.

Жывыя зносіны з людзьмі — гэта заўсёды як глыток паветра. Яны хітраваць не будуць, проста і даходліва скажуць, што добра, а што, мякка скажам, не вельмі. Таму падчас сустрэч яскрава відаць, што людзі не проста настроены ўдзельнічаць у выбарах — яны выбары чакаюць. На адным з участкаў маладыя выбаршчыкі заявілі, што «галасаваць прыйдзем датэрмінова, а ў дзень выбараў таксама прыйдзем, бо на нашым участку заўсёды класная праграма, так што ўсёй сям'ёй на выбары». І такі настрой адчуваецца практычна ўсюды.

Краіна ў чаканні галоўнай палітычнай падзеі, якая, без усялякіх сумненняў, пройдзе зладжана, арганізавана і, галоўнае, у адпаведнасці з заканадаўствам.

Вячаслаў ДАНІЛОВІЧ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы і культуры Палаты прадстаўнікоў:

— Жаданне грамадзян Рэспублікі Беларусь браць актыўны ўдзел у галасаванні на прэзідэнцкіх выбарах сведчыць аб падтрымцы палітычнага курсу дзеючай улады, аб разуменні адказнасці кожнага з нас за лёс нашай краіны, за захаванне міру і спакою ў ёй, за захаванне суверэнітэту беларускай дзяржавы. Упэўнены, што беларусы на прыкладзе іншых краін ва ўмовах геапалітычнага «шторму» перакаталіся, наколькі важная роля нацыянальнага лідара, яго здольнасць адстойваць інтарэсы народа, забяспечваць эфектыўнае функцыянаванне дзяржаўнага апарату і эканомікі. Сёння як ніколі раней усе мы выдатна разумеем каштоўнасць міру, спакою і суверэнітэту. Гэтых рэчаў вельмі цяжка дасягнуць, але іх вельмі лёгка страціць.

Настаўнік быў і застаецца апорай дзяржавы. Вядома, з якой павагай я стаўлюся да вашай працы. Пытанні сацыяльнай падтрымкі настаўнікаў, умацавання станоўчага іміджу педагога і школы — прыярытэтны кірунак нашай палітыкі. І праца ў гэтай сферы будзе працягнута. Да 2025 года мы выраўняем заработную плату работнікаў адукацыі з сярэдняй па краіне.

Аляксандр Лукашэнка
на Рэспубліканскім педагагічным савеце.
27 жніўня 2024 года.

І стымул, і істотная падтрымка

У снежні 2024-га Міністэрства адукацыі прыняло пастанову «Аб змене пастановы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 3 чэрвеня 2019 г. № 71».

У ведамстве паведамілі, што дакументам прадугледжана павышэнне заработнай платы за кошт павелічэння надбаўкі за працу: настаўнікам — на 39 % ад акладу, выхавальнікам і памочнікам выхавальнікаў устаноў дашкольнай адукацыі — на 20 % ад акладу, выкладчыкам, майстрам вытворчага навучання ўстаноў адукацыі — на 27 % і прафесарска-выкладчыцкаму складу — на 15 %. 35 % ад акладу атрымаюць маючыя ступень кандыдата навук, 55 % — доктара навук. Стане вышэйшым заробак і ў сацыяльных педагогаў і педагогаў-псіхолагаў — ім павялічылі надбаўку за працу на 20 % ад акладу. Акрамя таго, павялічваецца памер дыяпазону дапаўкі за асаблівыя ўмовы працы ў сярэднім на 10 % ад базавай стаўкі за працу з дзецьмі, якія маюць асаблівасці псіхафізічнага развіцця, расстройствы аўтыстычнага спектра, з невідушчымі навучэнцамі, з дзецьмі-сіротамі і дзецьмі, якія засталіся без апекі бацькоў, з ліку асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця.

Кожныя змяненні цягнуць за сабой як неабходнасць тлумачэнняў, так і мноства пытанняў, асабліва калі гаворка ідзе пра такую далікатную справу, як заработная плата. У сувязі з гэтым Беларускі прафесійны саюз работнікаў адукацыі і навукі арганізаваў гарачую тэлефонную лінію па пытаннях аплаты працы.

Аб вялікай колькасці званкоў, аб чым пытаюцца абаненты на тым канцы праводу і пра што цікавяцца больш за ўсё — расказала **загадчыца аддзела сацыяльна-эканамічнай работы прафсаюза Алена ВЯРБІЛА.**

— Больш за ўсё званкоў на гарачую лінію паступіла пасля свят, 8 студзеня. Быў дзень, калі такіх званкоў было 50. Тэлефануюць у асноўным тыя, каго змены не закранулі, — спецыялісты, якія пакуль не атрымалі надбаўкі.

Па словах загадчыцы аддзела, у гэту катэгорыю трапілі настаўнікі-дэфектолагі ўстаноў адукацыі і выхавальнікі груп падоўжанага дня ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі. Алена Вярбіла патлумачыла, што павышэнне заработнай платы — працэс паэтапны, што і прафсаюзы, і Міністэрства адукацыі працягваюць работу ў гэтым кірунку, прымаючы ўсе магчымыя меры, каб і гэтыя катэгорыі атрымалі павышэнне надбаўкі за працу ў галіне. Варта адзначыць, што Беларускі прафсаюз работнікаў адукацыі і навукі сумесна з адукацыйным ведамствам пастаянна клапоціцца аб павышэнні ўзроўню заработнай платы педагогаў. На працягу апошніх пяці гадоў узнагароджанне за працу падымалася некалькі разоў. А за апошнія два гады, адзначыла спецыяліст, прафсаюзы сумесна з Мінадукацыі зрабілі і працягваюць рабіць многае, каб павялічыць надбаўкі за кантракт і такім чынам павысіць заработную плату ўсім катэгорыям работнікаў, занятых у адукацыйнай сферы. Дзякуючы гэтым намаганням, канстатуе яна, сёння ў Мінску і асобных раёнах у абласцях надбаўка за кантракт установлена ў максімальным памеры.

Што датычыцца тэлефоннай лініі, то яна працягне сваю работу. Тэлефанаваць можна па буднях з 10.00 да 13.00 на нумар +375 (17) 270-04-53.

11.25 «Сёмая сімфонія». Маст. фільм (16+).
14.55 «Навука побач» (6+).
15.30 «Марафон адзінства».
18.55 «Бландзінка за вуглом». Маст. фільм (12+).
20.25 «Суразмоўцы».
20.40 «Калыханка» (0+).
21.05 «Старшыня». Маст. фільм (12+).
23.50 «Легенды эстрады».

Беларусь 5

7.00 Хакей. МХЛ. «Дынама-Шыннік» — «Лака» (Яраслаўль).
8.50 Змешаныя адзінаборствы.
9.55, 19.55 Біятлон. Кубак Расіі. Мужчыны.
11.10 Спартыўны інтарэс.
11.55 Баскетбол. Адзіная ліга. БК «Самара» — «Зеніт» (Санкт-Пецярбург).
13.45, 21.00 Біятлон. Кубак Расіі. Жанчыны.
14.55 Гандбол. Чэмпіянат Беларусі. Мужчыны. СКА-Мінск — «Мяшкоў» (Брэст).
16.35 На спорце.
16.55 Хакей. КХЛ. СКА (Санкт-Пецярбург) — «Салават Юлаеў» (Уфа). У перапынках — Спорт-цэнтр.
19.25 Як гэта было.
22.05 Спорт-цэнтр.
22.15 Бокс.

Беларусь 2

6.00 «Уключайся. Лепшае за тыдзень» (12+).
9.00, 16.20 Тэлебарометр.
9.05 «На нажах» (16+).
11.05 «Катак. Ледніковыя ўцёкі» (6+).
12.30 Драма «Гісторыя сям'і Блум» (12+).
14.05 Як дома (16+).
14.35 «Госць ля парога» (16+).
15.50 «Карысная праграма» (16+).
16.25 Дэтэктыў «Абанемент на расследаванне. Маленькія трагедыі» (16+).
19.50 «Мама дарагая!» (16+)
21.10 Спортлато 6 з 49, КЕНА.
21.15 Меладрама «Улётны экіпаж» (16+).

Нядзеля, 26 студзеня

Беларусь 1

5.30, 23.20 Камедыя «Белыя росы» (12+).
6.55 Клуб рэдактараў (16+).
8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 18.00, 20.00 «Выбары-2025».
8.20 Адзін дзень (12+).
8.45 Беларусь стваральная (12+).
9.20 «Арсенал» (12+).
9.55 Драма «На другім беразе» (12+).
12.20 Навіны. Цэнтральны рэгіён.
12.45 Меладрама «Разам з Верай» (12+).
13.35 «Я ведаю» (6+).
15.25 Вакол планеты.
16.05, 18.20 Меладрама «Паварот да шчасця» (16+).
23.00 Навіны надвор'я.

АНТ

7.00, 8.00, 9.00, 10.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00 Нашы навіны.
7.15 «Квітней Беларусь» (12+).
8.15 «Народны ДАСТ» (16+).
9.15 «Метэагід».
9.40, 10.15 «Здароўе» (16+).
11.20 «Бачылі відэа?» (6+)
13.20, 16.35 Фільм «Уваходзьце, зачынена!» (12+)
17.30, 18.35 «Тры акорды» (16+).
20.00 Контуры.
21.30 «Выбары-2025».
23.10 Фільм «Горка-салёнае мора кахання» (12+).

СТБ

6.00, 7.00, 8.00, 10.30, 13.30, 16.30, 22.30 Навіны «24 гадзіны».
6.20 Дак. праект «У пошуках ісціны».
7.20 «Культурны код» (6+).
8.35 Дак. праект «Назад у СССР» (16+).
9.50 «Беларуская супержанчына».
10.00 «Вялікі горад».
11.15, 14.20, 17.40 «Цвярская». Серыял (16+).
17.25 «Сенат».
19.30 «Тыдзень».
21.20 «Слова і справа».
21.35, 23.15 «Пенсільванія». Серыял (16+).

МІР

5.00 Мультфільмы (6+).
6.20 Маст. фільм «Радня» (16+).
8.20 «Дыктар робіць» (16+).
9.30 «ФазэндаЛайф» (6+).
10.00, 16.00 Навіны.
10.10 Маст. фільм «Ёлкі-палкі» (16+).
12.00, 16.15, 19.30, 1.00 Тэлесерыял «Мама-дэтэктыў» (16+).
18.30, 0.00 «Разам» (16+).
3.15 «Наша кіно. Гісторыя вялікай любові» (16+).
4.05 Тэлесерыял «Смяротны нумар» (16+).

Першы Інфармацыйны

5.00, 5.25, 5.55, 8.40, 9.45, 10.40, 11.40, 12.40, 13.25, 15.35, 15.55, 16.35, 17.25, 23.30, 1.30, 3.00, 3.35, 4.00, 4.25 Дайджэст.
5.05, 6.15, 7.10, 18.35, 1.15 Баявое дзяжурства (12+).
5.10, 6.40, 8.20, 09.25, 10.20, 12.45, 14.45, 16.20, 17.30, 19.20, 23.40, 1.35, 2.40 Спецыяльны рэпартаж (12+).
5.30, 7.40, 8.45, 9.50, 10.45, 11.45, 15.20, 16.40, 18.20, 19.40, 23.15, 1.20, 3.40, 4.10 Актуальнае інтэрв'ю (12+).
5.45, 7.15, 9.40, 14.20, 17.50, 0.20, 3.25 Аўтарскі погляд (12+).
6.00, 0.00 Гімн.
6.05, 6.30, 7.00 Вынікі тыдня.
6.20, 7.20, 9.20, 19.35 Сусветная навука (12+).
7.30, 10.35 Вам тэлеграм (12+).
8.00, 9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 20.00, 23.00, 0.05, 1.00, 2.00 Навіны.
11.20, 14.25, 2.20 Навіны. Цэнтральны рэгіён.
12.20, 15.40, 18.40, 3.05 Твой горад (12+).
13.20, 17.20, 2.15, 4.05 Громаў LIVE (12+).
13.30, 0.25, 4.30 Тэлефільм (12+).
19.00 Навіны прайм-тайм.

РТР—Беларусь

6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 11.30, 14.30, 17.30, 23.00 Беларусь. Навіны.
6.10, 07.10, 8.10, 9.15 Фільм «Муж маёй мары» (16+).
10.15 «Рэцэпт сапраўднага беларуса».
11.00, 14.00, 17.00 Весткі.
11.50 «Свае».
12.05 «Вялікія перамены».
13.05 «У пошуках ісціны».
14.50 «Гумар! Гумар! Гумар!!!» (16+)
17.50 «Песні ад усёй душы» (12+).
20.00 Весткі тыдня.
21.00 «Акцэнты».
22.00 «САСС упаўнаважаны заявіць».
23.20 Масква. Крэмль. Пуцін.
23.55 «Нядзельны вечар з Уладзімірам Салаўёвым» (12+).

НТБ—Беларусь

6.15 «Астрапрагноз».
6.20 Сэнс жыцця (12+).
6.55 Майстар-клас: як гэта зроблена? (6+)
7.25 Беларусы (6+).
8.00, 10.00, 16.00 Сёння.
8.20 «Навука побач» (6+).
8.55 Беларуская супержанчына.
9.05 VeloLove (6+).
9.25 Ежа хоць куды (6+).
10.20 Сямейная справа (6+).
10.40 «Кватэрнае пытанне.by» (12+).
11.15 «Першая перадача» (16+).
11.45 «Цуд тэхнікі» (12+).
12.30 «Дачны адказ» (0+).
13.30 Сёння. Галоўнае.
13.35 «НашСпажыўНагляд» (16+).
14.30 Фільм «Таму што кахаю» (12+).
16.20, 20.00 Галоўнае. Сёння. Беларусь.
16.30 «Следства вялі...» (16+)
18.05 «Новыя рускія сенсацыі» (16+).
19.00 «Вынікі тыдня».
20.15 Дэтэктыў «Качэўніца» (16+).
23.35 «Ты не паверыш!» (16+)

Беларусь 3

7.20 «Як мы вясну ладзілі». Мультфільм (0+).
7.30 «Дзед Мароз і лета». Мультфільм (0+).
7.50 «Веды ў кубе».
8.30 «Бландзінка за вуглом». Маст. фільм (12+).

9.50 «Наперад у мінулае».
10.30 «Беларуская кухня».
10.55 «Нацыянальны хіт-парад».
11.50 «Культурны тыдзень».
12.30 «Паўлінка». Спектакль.
14.00 «Старшыня». Маст. фільм (12+).
16.45 «Архітэктура Беларусі».
17.00 «Суперлато».
17.30 Вечары з Сімфанічным аркестрам.
18.40 «Міравы хлопец». Маст. фільм (12+).
20.00 «Культурны тыдзень».
20.40 «Калыханка» (0+).
21.05 «Сёмая сімфонія». Маст. фільм (16+).

Беларусь 5

6.55, 9.10 На спорце.
7.15 Хакей. КХЛ. СКА (Санкт-Пецярбург) — «Салават Юлаеў» (Уфа).
9.30 Гандбол. Чэмпіянат Беларусі. Мужчыны. СКА-Мінск — «Мяшкоў» (Брэст).
10.55 Як гэта было.
11.25, 20.10 Біятлон. Кубак Расіі. Мужчыны.
12.20 Змешаныя адзінаборствы.
14.25, 21.05 Біятлон. Кубак Расіі. Жанчыны.
15.20 Баскетбол. Адзіная ліга. «Уралмаш» (Екацярынбург) — ЦСКА (Масква).
16.55 Хакей. КХЛ. ХК «Сочы» — «Поўначсталь» (Чарапавец). У перапынках — Спорт-цэнтр.
19.25 Вынікі тыдня.
22.00 Бокс.

Беларусь 2

6.00 «Уключайся. Лепшае за тыдзень» (12+).
9.00, 11.25, 15.45 Тэлебарометр.
9.05 «На нажах» (16+).
10.55 Я з вёскі (12+).
12.00 Смачна есці (12+).
12.45 «Абмен дамамі» (16+).
14.05 «Мама дарагая!» (16+)
15.20 «Карысная праграма» (16+).
15.50 Драма «Гісторыя сям'і Блум» (12+).

17.25 «Уральскія пельмені» (16+).
18.45 «Вялікія дзяўчынкі» (16+).
21.10 Спортлато 5 з 36, КЕНА.
21.15 Серыял «ІП Пірагова» (16+).
22.10 Серыял «Фітнес» (16+).

КАБ НІХТО НЕ САПСАВАЎ СВЯТА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Па словах прадстаўніка МУС, палова месцаў, дзе размешчаны ўчасткі для галасавання, будуць абсталяваны сістэмамі відэаназірання рэспубліканскай сістэмы маніторынгу грамадскай бяспекі: «Сёння праводзяцца дадатковыя інструктажы па парадку нясення службы з асабовым складам, арганізавана адпрацоўка тыпавых алгарытмаў дзеянняў ва ўзаемадзеянні са старшынямі выбарчых камісій. Акрамя таго, Дзяржаўтаінспекцыяй абследавана вулічна-дарожная сетка, забяспечаны кантроль за прывядзеннем дарожнымі і камунальнымі арганізацыямі праезнай часткі і тратуараў у належны стан». Аляксандр Купчэня звярнуў увагу на выкананне правілаў стаянкі і прыпынку паблізу выбарчых участкаў. З боку супрацоўнікаў Дзяржаўтаінспекцыі будзе забяспечаны пастаянны кантроль, будуць прымацца меры ў адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам.

Асноўныя намаганні сканцэнтраваны на забеспячэнні правапарадку непасрэдна падчас галасавання выбаршчыкаў. «З 20 студзеня асабовы склад органаў унутраных спраў і ваеннаслужачых унутраных войскаў пераводзіцца на ўзмоцнены варыянт нясення службы. Для каардынацыі дзеянняў асабовага складу, збору і аналізу інфармацыі прадугледжана функцыянаванне аператыўна-сітуацыйных штабоў на ўсіх узроўнях. Канцэпцыяй забеспячэння бяспекі прадугледжана кругласутачнае нясенне службы асабовага складу на ўсіх участках для галасавання шляхам выстаўлення пастоў. Міліцыянеры будуць знаходзіцца паблізу памяшканняў для галасавання ў гатоўнасці зрэагаваць і аказаць неабходнае садзейнічанне камісіям у падтрыманні парадку. Акрамя таго, да месцаў правядзення галасавання таксама будуць набліжаны нарады адзінай дыслакацыі. Мы прадугледжваем дадатковыя мабільныя групы і групы хуткага рэагавання ў поўнай экіпіроўцы з аўтаматычнай зброяй, што будуць гатовы аказаць імгненную дапамогу».

Як адзначыў спікер, дзякуючы названым мерам, ні адно правапарушэнне, ні адно супрацьпраўнае дзеянне не застанецца па-за ўвагай. Для забеспячэння рэагавання на магчымыя правакацыі, аказання дапамогі і садзейнічання супрацоўнікам органаў унутраных спраў будуць прыцягвацца члены добраахвотных дружын, ветэраны органаў унутраных спраў і прадстаўнікі БРСМ. Акрамя таго, будзе забяспечана бяспека членаў выбарчых камісій пры перавозцы бюлетэняў, а таксама пры працэдуры галасавання асобных катэгорый грамадзян па месцы жыхарства.

«З улікам вопыту мінулых гадоў пад асаблівай увагай будзе любая інфармацыя, якая змяшчае пагрозы або абразы ў дачыненні да членаў выбарчых камісій або старшыняў камісій. Кожнаму такому факту будзе давацца імгненная ацэнка і прымацца меры рэагавання ў адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам. Хачу яшчэ раз звярнуць увагу, што аператыўна-прафілактычныя мерапрыемствы па выяўленні і фіксацыі такіх правапарушэнняў працягваюцца і знаходзяцца на пастаянным кантролі. Меры, якія прымаюцца, дазволяць забяспечыць своечасовае рэагаванне ў выпадку ўскладнення аператыўнай абстаноўкі. Органы ўнутраных спраў гатовыя да выканання пастаўленых задач», — падагульніў Аляксандр Купчэня.

«НЕ ТОЛЬКІ КАНТРОЛЬ, АЛЕ І ЗАБЕСПЯЧЭННЕ ПАЖАРНАЙ БЯСПЕКІ...»

Міністрам па надзвычайных сітуацыях прынята адпаведнае рашэнне аб арганізацыі работы падрыхтоўкі правядзення выбараў, якім прадугледжаны комплекс мер, што ўключаюць работу па прафілактыцы ўзнікнення надзвычайных сітуацый, а таксама аператыўнага рэагавання. Аб гэтым расказаў **першы намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення аварыйна-ратавальных службаў і рэагавання на надзвычайныя сітуацыі Аляксей НАВІЦКІ**: «Органамі дзяржаўнага пажарнага нагляду забяспечана правядзенне абследаванняў супрацьпажарнага стану больш за 4,5 тысячы аб'ектаў, на якіх будуць размяшчацца выбарчыя ўчасткі. З мэтай павышэння ўзроўню пажарнай бяспекі работнікамі МНС аказана ўся неабходная практычная дапамога, праведзены адпаведныя інструктажы аб мерах пажарнай бяспекі».

Па яго словах, у падраздзяленнях МНС праведзена больш за чатыры тысячы заняткаў з ратавальнікамі і з работнікамі дзяжурных змен па тактыцы тушэння пажараў на тыпавых аб'ектах, якія будуць размяшчацца ў выбарчых участках. У тым ліку дадаткова вывучаны характарыстыкі аб'ектаў, маршруты руху, месца размяшчэння вонкавага пажарнага водазабеспячэння.

«Для арганізацыі дзяжурства ў асноўны дзень галасавання 26 студзеня на выбарчых участках будзе задзейнічана пяць тысяч работнікаў органаў падраздзялення па надзвычайных сітуацыях, — дадаў Аляксей Навіцкі. — Для перыядычнага кантролю падчас датэрміновага галасавання з 21 да 25 студзеня плануецца задзейнічаць 1600 работнікаў сістэмы МНС. Непасрэдна ў асноўны дзень галасавання ўсе работнікі органаў падраздзялення пяройдуць на ўзмоцнены варыянт нясення службы. На баявое дзяжурства заступіць 3700 ратавальнікаў, 1400 адзінак пажарнай ратавальнай тэхнікі».

«Наша задача падчас дзяжурства — не толькі кантроль за забеспячэннем пажарнай бяспекі, але і своечасовае выяўленне пажараў і іншых надзвычайных сітуацый, паведамленне пра іх, эвакуацыя людзей у выпадку іх узнікнення, тушэнне ўзніклых пажараў першаснымі сродкамі пажаратушэння, а таксама сустрэча падраздзяленняў МНС, аператыўнае рэагаванне на надзвычайныя сітуацыі і іншыя здарэнні. У цэлым, органы падраздзяленняў МНС гатовыя да забеспячэння бяспекі ў перыяд правядзення выбараў», — запэўніў Аляксей Навіцкі.

Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.

СУСТРЭЧЫ

НАПЕРАДЗЕ — ЛЁСАВЫЗНАЧАЛЬНЫ ВЫБАР

У межах Адзінага дня інфармавання ў працоўных калектывах і студэнцкіх аўдыторыях абмяркоўвалі электаральную кампанію

«Няпросты перыяд нам дапамогуць прайсці толькі яднанне і згуртаванасць»

Менавіта такую думку выказаў **намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Уладзімір ПЯРЦОЎ** на сустрэчы са студэнтамі і выкладчыкамі Віцебскага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта (ВДТУ). Падчас адкрытага дыялогу абмяркоўваліся асаблівасці і адрозненні выбарчых кампаній гэтага і мінулага гадоў, важнасць удзелу ў выбарах і шэраг іншых.

Намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта расказаў удзельнікам сустрэчы аб станаўленні незалежнай і суверэннай Беларусі, аб працэсе, які ішоў на яго вачах. Ён падкрэсліў, што з-за цяперашняй напружанай геапалітычнай абстаноўкі за межамі краіны да нас усё часцей сталі прыязджаць мігранты ў пошуку стабільнасці і спакою. Наша дзяржава, прытрымліваючыся мірнай палітыкі, дае людзям доўгачаканыя мір, спакой і ўпэўненасць у заўтрашнім дні. У той час калі ў суседніх краінах спрабуюць ладзіць рознага роду каляровыя рэвалюцыі і разгойдваць іх звонку, у Беларусі народ не паддаецца на дэструктыў, які ідзе ад калектыўнага Захаду. «Толькі згуртаванасць і яднанне ўсяго беларускага народа, у тым ліку вакол нашага Прэзідэнта, нашых нацыянальных каштоўнасцяў, таго, што нам патрэбна такая краіна, бо ў нас іншай няма, дапамогуць, дадуць нам магчымасць прайсці гэты перыяд», — падкрэсліў Уладзімір Пярцоў.

«Навучыцеся крытычна ставіцца да інфармацыі»

Такую параду працаўнікам УП «Мінскметрабуд» і ААТ «Мінскметрапраект» даў **міністр інфармацыі Марат МАРКАЎ** падчас сустрэчы з калектывам на тэму: «Удзел у выбарах — права і грамадзянскі абавязак кожнага».

Падчас размовы міністр падрабязна расказаў пра этапы найважнейшай палітычнай падзеі гэтага года — выбараў Прэзідэнта. Ён падкрэсліў, што «гэтыя выбары мы праводзім для сябе, і мы пазбавіліся ад характэрнай рысы, калі нам неабходна было адабрэнне звонку, ад заходніх «партнёраў».

Асобную ўвагу міністр інфармацыі ўдзяліў сусветнай практыцы прымянення тэхналогій маніпулявання грамадскай свядомасцю, а таксама дыпфэйкаў у сетцы інтэрнэт.

«Беларусы ўсведамляюць высокую ступень яднання, якая ёсць у нашай дзяржаве»

Адзначыў намеснік **старшыні Савета Рэспублікі Сяргей ХАМЕНКА** пасля сустрэчы з працоўным калектывам ААТ «Эксперыментальная база «Вольна».

Сяргей Хаменка таксама заўважыў, што Вольна — гэта населены пункт у Баранавіцкім раёне, які мае даўнюю гісторыю, што пачалася яшчэ ў XVI стагоддзі. «На гэтай зямлі жывуць людзі, якія захоўваюць свае традыцыі, памятаюць сваю гісторыю і разумеюць задачы, якія стаяць перад кожным грамадзянінам Беларусі», — падкрэсліў ён. І дадаў, што адбыўся дыялог з людзьмі, занятымі ў сельскай гаспадарцы, і яны выдатна разумеюць, што выбары — гэта, з аднаго боку, права кожнага чалавека, а з другога — грамадзянскі абавязак: выбраць сваю будучыню, ацаніць дзейнасць кіраўніка дзяржавы і тую карысць, якую ён прынёс Беларусі, а таксама намеціць перспектывы на будучыню.

Паводле БелТА, прэс-службаў Міністэрства інфармацыі і Савета Рэспублікі.

Тым часам

Галоўны крытэрый — аб'ектыўнасць

Міжнародныя назіральнікі пазнаёміліся з работай выбарчых камісій Міншчыны

Міжнародныя назіральнікі будуць удзельнічаць у маніторынгу як датэрміновага, так і асноўнага дня галасавання. Сярод тых, хто будзе назіраць за падрыхтоўкай і правядзеннем выбараў, — **намеснік дырэктара Дэпартамента Выканаўчага камітэта СНД Ісламджан КАРЫМАЎ і саветнік Выканкама СНД Ірына ЦАЛІКАВЕЦ**. У чацвер яны сустрэліся з членамі Мінскай абласной камісіі па выбарах.

З назіральнікамі сустрэўся намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Аляксандр Ільясевіч. Ён праінфармаваў аб падрыхтоўцы да выбарчай кампаніі ў вобласці, аб пытаннях, якія выбаршчыкі адрасуюць мясцовым органам улады. Пытанні, як заўважыў Аляксандр Ільясевіч, традыцыйныя. У асноўным зваротаў датычацца тлумачэння парадку правядзення галасавання, якім чынам замацавацца за тым ці іншым участкам, які бліжэй знаходзіцца адносна месца рэгістрацыі выбаршчыка, як можна прыйсці і прагаласаваць. Грамадзяне таксама ўдакладняюць графік работы камісій у перыяд датэрміновага галасавання.

Намеснік дырэктара Дэпартамента Выканаўчага камітэта СНД Ісламджан Карымаў паведаміў, што на сёння акрэдытавана больш як 300 міжнародных назіральнікаў ад краін СНД, у тым ліку 40 доўгатэрміновых з ліку Выканкама СНД і прадстаўнікоў дыпламатычных устаноў у рамках СНД у Мінску. «Усе яны вопытныя людзі, многія неаднаразова ўдзельнічалі ў выбарчых працэсах у якасці міжнародных назіральнікаў», — адзначыў Ісламджан Карымаў. Паводле яго слоў, галоўны крытэрый работы міжнародных назіральнікаў — аб'ектыўнасць: «Мы выходзім са сваіх назіранняў непасрэдна на месцах. Уся інфармацыя абагульняецца, перадаецца ў штаб, дзе і апрацоўваецца. Усе высновы будуць агучаны ў працэсе прэс-канферэнцыі ўжо пасля выбараў. Я хачу падкрэсліць, што мы не ўмешваемся ва ўнутраныя справы, у выбарчы працэс, не палітызуем сітуацыю, захоўваем палітычную нейтральнасць».

Пасля сустрэчы з кіраўніцтвам выбарчай камісіі Мінскай вобласці міжнародныя назіральнікі наведалі Слуцкі і Стаўбцоўскі раёны.

ГАРАНТЫІ ДАБРАБЫТУ

Моцная сацыяльная палітыка — прыярытэт беларускай мадэлі развіцця

У чым выяўляецца сацыяльная накіраванасць нашай эканомікі і якім чынам дзяржава забяспечвае павышэнне якасці жыцця людзей, у эфіры тэлеканала «Беларусь 1» расказаў першы намеснік міністра эканомікі Андрэй КАРТУН.

Пра галоўныя дасягненні сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі за апошнія 30 гадоў падрабязна расказаў Андрэй Картун.

Ён падкрэсліў: за гады суверэнітэту беларуская мадэль сацыяльна-эканамічнага развіцця даказала сваю эфектыўнасць. Бо ў яе аснове ляжаць інтарэсы простага чалавека, людзі яе шырока падтрымліваюць.

Першы намеснік міністра эканомікі канстатаваў, што эканамічны фактар роўны стабільнасці ў дзяржаве і ў грамадстве:

— Яшчэ ў 1994 годзе ў нас было каля 40 % малазабяспечаных. І, як Прэзідэнт пра гэта часта кажа, тады стаяла задача адвесці краіну ад прорвы. І сапраўды, з такім узроўнем можна было арганізаваць любую рэвалюцыю. Але цяпер, напрыклад, калі падвесці вынікі 30-годдзя, узровень малазабяспечанасці ў Беларусі адзін з самых нізкіх у свеце. Ён складае каля 3 %. Гэта нічога. Таму сацыяльны складнік апраўдвае сябе.

Ён дадаў, што ў сярэднім з дзяржаўнага бюджэту каля 40 % выдаткоўвацца на сацыяльную сферу:

— Сацыяльная накіраванасць адзначаецца і ў дзяржпраграмах. Напрыклад, з 36 дзяржаўных праграм 25 — прамой сацыяльнай накіраванасці. Адпаведна, уся эканоміка ўскосна так ці інакш звязана з сацыяльным блокам.

Андрэй Картун прывёў красамоўныя прыклады:

— Мы дасягнулі добрага паказчыка па дыферэнцыяцыі багатых і бедных: ён адзін з самых нізкіх у свеце. У нас ёсць такі паказчык: суадносіны 10 % бедных і 10 % багатых. Паказчык суадносін іх даходаў — 6,1 раза. Па гэтым значэнні мы зраўняліся са скандынаўскімі краінамі літаральна за год.

Ён нагадаў аб такім немалаважным паказчыку, як рэальныя даходы насельніцтва:

— Яшчэ ў пачатку 1990-х заробак у Беларусі ў сярэднім быў 20 долараў, а цяпер ён большы за 700 долараў. У рэальным выражэнні, калі браць за 30 гадоў, у нас даходы выраслі ў 9 разоў.

Ён патлумачыў, у чым гэта выяўляецца:

— Ёсць такі эканамічны паказчык — ВУП на душу насельніцтва (гэта калі ў сукупнасці ўсе нашы выгоды дзеляцца на колькасць жыхароў). Дык вось гэты паказчык вырас у 6 разоў: быў усяго толькі 5 тысяч долараў, а цяпер ён большы за 30 тысяч. Па сутнасці, адзін жыхар у нас можа прыўнесці 30 тысяч дабаўленай вартасці.

Андрэй Картун дадаў таксама, што ёсць і ўскосны паказчык, які характарызуе ў тым ліку сацыяльную накіраванасць, — гэта забеспячэнне жыллём:

— Нашы значэнні адны з самых высокіх у Еўропе, — падкрэсліў ён.

— З нашым актыўным будаўніцтвам жылля Беларусь наблізілася да паказчыка ў 30 квадратных метраў на чалавека. Мяркую, мы перавысім яго нават у гэтым годзе. Хоць, здавалася б, гэта не прамая сацыяльная функцыя, але мы заняліся гэтым пытаннем і цяпер яго актыўна развіваем.

Прадстаўнік Мінэканомікі таксама адзначыў, што ёсць яшчэ рэйтынг індэкса чалавечага развіцця, у які ўваходзіць узровень даходаў, адукацыі нацыі.

— Дык вось па гэтым паказчыку мы заўсёды стабільна ўваходзім у топ-70, — рэзюмаваў ён.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

Организатор аукциона/ оператор	ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. www.ipmtorgi.by
Продавец	ОАО «Осиповичи», 225855, Брестская обл., Дрогичинский р-н, д. Осиповичи, ул. Советская, д. 17

Предмет электронных торгов	**Начальная цена, бел. руб.**
Лот № 1 – Жилой дом (здание одноквартирного жилого дома), инв. номер 121/С-17954, общей площадью 70,7 кв. м, по адресу: Брестская обл., Дрогичинский р-н, Антопольский с/с, д. Новосёлки, ул. Новая, 2 Составные части и принадлежности: пристройка, сарай	**3 096,40 (без НДС) Снижение на 60 %**
Лот № 2 – Жилой дом (здание одноквартирного жилого дома), инв. номер 121/С-17953, общей площадью 70,2 кв. м, по адресу: Брестская обл., Дрогичинский р-н, Антопольский с/с, д. Новосёлки, ул. Новая, 1 Составные части и принадлежности: пристройка, сарай, колодец	**2 882,59 (без НДС) Снижение на 60 %**
Лот № 3 – Здание коровника (здание специализированное животноводства), инв. номер 121/С-17956, общей площадью 1836,3 кв. м, по адресу: Брестская обл., Дрогичинский р-н, Антопольский с/с, 6, 0,2 км западнее д. Новосёлки	**40,00 с НДС 20 %**

Задаток 10 % от начальной цены предмета электронных торгов **(по лотам №№ 1, 2) и задаток в размере 40,00 бел. руб. (по лоту № 3)** перечисляется в белорусских рублях на счет BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 37853865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней со дня завершения электронных торгов.

Условия оплаты предмета электронных торгов

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившиеся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати)** календарных дней после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов, установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившиеся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязаны возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **8 %** от цены продажи лота №1 и **10 %** от цены продажи лотов №№ 2–3 в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 19.12.2024 г.

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов, без объяснения причин снятия.

Дата и время начала и окончания электронных торгов: 29.01.2025 г. с 11.00 до 13.00.
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов.

Дата и время окончания приема заявок:
заявки на участие в электронных торгах принимаются по **28.01.2025 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

Контактные данные	**Тел.: +375 (17) 373 21 33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by**

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»
(Организатор электронных торгов, Оператор электронной торговой площадки) извещает о проведении повторных электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего **ОАО «Премьерлизинг»** (Продавец).

Электронные торги состоятся 28.01.2025.

Лот № 1: Магазин «Универсам»
с инв. № 200/С-55222, площадь – 942,8 кв. м.

Адрес: Витебская область, г. Витебск, ул. Лазо, д. 129А.
Земельный участок № 240100000001002906, 0,3738 га.
Право постоянного пользования.

Обременения: ипотека, аренда.

Подписание договора купли-продажи и его регистрация возможны только при условии получения согласия залогодержателя по договору об ипотеке.

Организатор электронных торгов и Продавец не несут ответственности за незаключение договора купли-продажи с Победителем электронных торгов (Претендентом на покупку) по причине, вызванной обстоятельствами, изложенными выше.

Начальная цена с НДС 20 % – 741 400,00 долларов США.
Задаток – 259 193,44 руб. **Шаг электронных торгов** – 5 %.

Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП).

Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП.

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: **23.01.2025 в 16.00.**

Организатор электронных торгов:
☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, torgi@ino.by
Электронный адрес ЭТП: gostorg.by

УНП 190055182

Считать недействительными утерянные ЗАО «СК «Белросстрах» бланки страховых полисов: ***«Добровольное страхование от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу» форма 2РН, 2РП серия БИ №№ 1905499, 1905500, 1911551 – 3 шт.***

УНП 100782388

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»
(Организатор электронных торгов, Оператор электронной торговой площадки) извещает о проведении повторных электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего **ОАО «Премьерлизинг»** (Продавец).

Электронные торги состоятся 28.01.2025 г.

Лот № 1: Торговый комплекс
с инв. № 200/D-168451, 1599,8 кв. м.

Адрес: Витебская область, г. Витебск, ул. Богатырева, 8А-3.

Торговый комплекс с инв. № 200/D-168451 находится в капитальном строении с инв. № 200/С-81193, расположенном на земельном участке 240100000001009153 площадью 0,2152 га.
Право аренды. Доля: 9/10
Обременения: ипотека, аренда, сервитут.

Подписание договора купли-продажи и его регистрация возможны только при условии получения согласия залогодержателя по договору об ипотеке.

Организатор электронных торгов и Продавец не несут ответственности за незаключение договора купли-продажи с Победителем электронных торгов (Претендентом на покупку) по причине, вызванной обстоятельствами, изложенными выше.

Начальная цена с НДС 20 % – 1 183 309,55 долларов США.
Задаток – 413 685,01 руб. **Шаг электронных торгов** – 5 %.

Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП). Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП.

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: **23.01.2025 в 16.00.**

Организатор электронных торгов:
☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, torgi@ino.by
Электронный адрес ЭТП: gostorg.by

УНП 190055182

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»
(Организатор электронных торгов, Оператор электронной торговой площадки) извещает о проведении повторных электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего **ОАО «Премьерлизинг»** (Продавец).

Электронные торги состоятся 28.01.2025 г.

Лот № 1: Магазин № 20 (1-ый этаж) с инв. № 350/D-152513, 997,2 кв. м. Находится в кап. строении № 350/С-5149, расположенном на земельном участке № 340100000006001545 (0,0866 га). Адрес: Гомельская обл., г. Гомель, пр-т Октября, 67.

Лот № 2: Помещение торгового центра с инв. № 300/D-6524, 1275,4 кв. м. Находится в кап. строении № 300/С-1803, расположенном на земельном участке № 340100000003000486 (0,1979 га). Адрес: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Царикова, 5А-1.

Лот № 3: Торгово-сервисный центр с инв. № 200/С-77262, 1745,4 кв. м. Адрес: Витебская обл., г. Витебск, ул. Короткевича, 24. Земельный участок № 240100000003004520, 0,2476 га. Право аренды.

Лот № 4: Универсам с инв. № 200/С-86854, 1116,3 кв. м. Витебская обл., г. Витебск, ул. Баграмяна, 10. Земельный участок № 240100000003007642, 0,3158 га. Право аренды.

Лот № 5: Помещение магазина с инв. № 610/D-52517, 1200,4 кв. м. Находится в кап. строении № 610/С-1810, расположенном на земельном участке № 640400000001000421 (0,7718 га). Адрес: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. Лопатина, 162-65.

Обременения по Лотам №№ 1–5: Аренда, ипотека, залог права аренды земельного участка.

Подписание договора купли-продажи и его регистрация возможны только при условии получения согласия залогодержателя по договору об ипотеке.

Организатор электронных торгов и Продавец не несут ответственности за незаключение договора купли-продажи с Победителем электронных торгов (Претендентом на покупку) по причине, вызванной обстоятельствами, изложенными выше.

Начальная цена с НДС 20 %:
Лот № 1 – 904 659,84 доллара США. Задаток – 316 269,08 руб.
Лот № 2 – 1 060 622,64 доллара США. Задаток – 370 793,68 руб.
Лот № 3 – 2 167 786,80 доллара США. Задаток – 757 858,26 руб.
Лот № 4 – 1 527 098,40 доллара США. Задаток – 533 873,60 руб.
Лот № 5 – 1 163 187,60 доллара США. Задаток – 406 650,39 руб.

Шаг электронных торгов – 5 %.

Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП). Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП.

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: **23.01.2025 в 16.00.**

Организатор электронных торгов:
☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, torgi@ino.by
Электронный адрес ЭТП: gostorg.by

УНП 190055182

ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННОГО АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»
(организатор торгов и оператор электронной торговой площадки: torgi.rlt.by, место нахождения: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 321)
по поручению **государственного учреждения «Несвижский районный территориальный центр социального обслуживания населения»**
(продавец, место нахождения: Минская обл., г. Несвиж, ул. Ленинская, 115а) проводит открытый аукцион

по продаже легкового специального джипа VAZ-2123 «Chevrolet Niva»,

2013 года выпуска, кузов (VIN) X9L212300D0469329, цвет – серебристый, находящегося по адресу: Минская область, г. Несвиж, ул. Ленинская, 115а.

Начальная цена без НДС (20 %) – **7 900,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **790,00** бел. руб.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в Положении 609, размещенном на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Электронные торги состоятся **21.02.2025** в **10.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **20.02.2025** до **17.00** по указанному адресу **в каб. 320.**

Тел.: (8017) 516-80-64, (8029) 136-31-11.
Тел. для осмотра: +375 (29) 550-97-66; 8 (01770) 21906.
Информация о торгах опубликована на сайтах: minsk-region.gov.by, gki.gov.by, torgi.rlt.by.

УНП 690250778

Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Предметы аукциона	Начальная цена, руб.	Размер задатка, руб.
Лот № 1: изолированное помещение с инвентарным номером 141/D-8038 (наименование: квартира № 2; назначение: квартира), площадью 35,2 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Жабинковский р-н, Ленинский с/с, аг. Ленинский, ул. Парковая, 118-2	1 600,00	160,00
Лот № 2: изолированное помещение с инвентарным номером 141/D-8037 (наименование: квартира № 1; назначение: квартира), площадью 34,3 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Жабинковский р-н, Ленинский с/с, аг. Ленинский, ул. Парковая, 118-1	1 600,00	160,00
Лот № 3: изолированное помещение с инвентарным номером 141/D-8039 (наименование: квартира № 4; назначение: квартира), площадью 34,7 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Жабинковский р-н, Ленинский с/с, аг. Ленинский, ул. Парковая, 118-4	1 600,00	160,00
Лот № 4: изолированное помещение с инвентарным номером 141/D-8040 (наименование: квартира № 5; назначение: квартира), площадью 35,2 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Жабинковский р-н, Ленинский с/с, аг. Ленинский, ул. Парковая, 118-5	1 600,00	160,00

Продавец: ОАО «Рогознянский», 225111, Брестская обл., Жабинковский р-н, аг. Ленинский, ул. Ленина, 14, тел. 80164165133. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329, тел./ф 80162408701. Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона до подачи заявления. **Р/с для перечисления задатка:** р/с BY32BAPB30127866600100000000 в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245, код платежа 40901. **Условия продажи:** без условий. **Срок заключения договора купли-продажи:** в течение 20 рабочих дней со дня проведения аукциона. **Условия оплаты:** согласно заключенного договора купли-продажи. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, в течение 3 рабочих дней со дня аукциона возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатора аукциона. **Срок возможного отказа от проведения аукциона:** не позднее, чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона. **Шаг аукциона:** 5 % от предыдущей названной цены

Аукцион состоится 04 февраля 2025 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325

Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, порядок, в соответствии с которым проводится аукцион, а также иная информация содержатся на сайте Организатора аукциона www.ocenkabrest.by, а также можно узнать по телефонам: 8 (0162) 40-87-01, 40-87-02

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00

Последний день приема заявлений – 03 февраля 2025 г. до 17.00

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»
(Организатор электронных торгов, Оператор электронной торговой площадки) извещает о проведении повторных электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего **ОАО «Белыничский райагропромтехснаб»** (Продавец).

Электронные торги состоятся 28.01.2025 в 11.00

Лот № 1: Производственный цех с инв. № 701/С-11253, 683,8 кв. м,

Могилевская обл., Белыничский р-н, Вишовский с/с, 17, вблизи д. Большой Нежков.

Начальная цена с НДС 20 % – 57 300,66 руб.
Задаток – 5 730,07 руб. Обременение: аренда.

Земельный участок 720480500001000007 (площадь 0,2350 га). Право постоянного пользования.
Шаг электронных торгов – 5 %.

Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП).
Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП.
Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.
Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: **23.01.2025 в 16.00.**

Организатор электронных торгов:
☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, torgi@ino.by.
Электронный адрес ЭТП: gostorg.by

УНП 190055182

ИНФОРМАЦИЯ
о проведении открытого аукциона 20 февраля 2025 г. по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома в г. Смолевичи

Организатор аукциона:
Смолевичский районный исполнительный комитет, 222201, г. Смолевичи, ул. Советская, д. 125.

№ лота	Адрес земельного участка	Кадастровый номер	Площадь (га)	Целевое назначение	Начальная цена земельного участка (бел. руб.)
1	г. Смолевичи, ул. В. Быкова, д. 18	624850100 008000337	0,15	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	30 000
2	г. Смолевичи, ул. Тадеуша Костюшко, 19	624850100 008000882	0,1658	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	33 000

Аукцион состоится 20 февраля 2025 г. в 15.00 в Смолевичском районном исполнительном комитете по адресу: *г. Смолевичи, ул. Советская, д. 125*, зал заседаний.
Извещения о проведении аукциона размещены на сайтах: Государственного комитета по имуществу: https://au.nca.by/, http://rlt.by/ru/, Смолевичского райисполкома: isp@smolevichi.gov.by, на сайте Минского областного исполнительного комитета.

УНП 600014139

ПАРАЛЕЛІ

БАНДЫЦКАЯ ВАРШАВА

Чаму ў Польшчы беларусам жыць небяспечна?

23-гадоваму паляку, які абвінавачваецца ў згвалтаванні і забойстве 25-гадовай беларускі, запыталі пажыццёвае зняволенне, паведаміў партал wiadomosci.wp.pl. Адзначаецца, што суд пачаўся 4 снежня і ў асноўным праходзіў у закрытым рэжыме. На апошнім слуханні, якое таксама адбылося без агалоскі, бакі выказалі свае заключныя аргументы. У пракуратуры пацвердзілі, што аналізы паказалі дзеяздольнасць зламысніка. Сёння павінен быць вынесены прыгавор. Жудаснае здарэнне ў польскай сталіцы перакрэслівае ўсе рэкламныя турыстычныя постары наконт таго, што ў суседняй дзяржаве бяспека, стабільнасць і росквіт. Што ж адбываецца ў краіне, якая цяпер старшынствуе ў Еўрасаюзе?

НОЖ І БАЛАКЛАВА

Жудасны інцыдэнт з беларускай здарыўся летась у цэнтры Варшавы ў ноч з 24 на 25 лютага, калі яна вярталася дадому. Згодна з запісамі з камер відэаназірання, перад тым як напасці, зламыснік сачыў за дзяўчынай на працягу доўгага часу. Пасля падышоў да яе ззаду, схапіў, надзеў на галаву балаклаву і, пагражаючы нажом, павалок да брамы, якая знаходзіцца каля жылога дома. Злачынца пачаў душыць дзяўчыну і зрываць адзенне, зацягнуў у падваротню і згвалтаваў. Пасля гэтага ён бесперашкодна сеў у трамвай і з'ехаў у бок жылога раёна Макатоў.

Адзначаецца, што на камерах відэаназірання відаць: людзі, якія праходзілі міма ў момант згвалтавання, ніяк не адрэагавалі на дзеянні злачынцы. Пра здарэнне расказаў ахоўнік дома, які павінен быў выйсці раніцай на працу. Ён знайшоў распранутую жанчыну на прыступках дома і патэлефанаваў у экстранныя службы. Беларуску даставілі ў шпіталь у цяжкім стане. Праз некалькі дзён яна памерла ў бальніцы Варшаўскага медыцынскага ўніверсітэта.

Падазраванага хутка затрымалі. Падчас вобыску ў яго кватэры знайшлі вялікі нож і балаклаву. Злачынца распавёў суду, што яму трэба было заплаціць за кватэру, але грошай не было. Ён вырашыў абрабаваць краму ці кавярню. У адным з бараў убачыў украінцаў, думаў пажывіцца за іх кошт, але не атрымалася. І тут паляк убачыў беларуску…

Следства па гэтай справе працягвалася каля года, і мы хутка даведаемся пра судовы вердыкт.

Справа паказальная, яна дакладна адлюстроўвае сітуацыю, якая склалася. Беларусы ўсё часцей сутыкаюцца ў суседняй дзяржаве з нападкамі і беззаконнем, але толькі рэдкія выпадкі становяцца вядомыя грамадскасці, разбіраюцца праваахоўнікамі і тым больш даходзяць да суда.

«З'ЯЗДЖАЙ У СВАЮ КРАІНУ, БУЛЬБАШ»

Цікаванню з боку мясцовага насельніцтва падвяргаюцца нашы суайчыннікі ўсіх узростаў. За выбар бацькоў, якія вырашылі пераехаць у Польшчу, расплачваюцца дзеці. Жыццёвыя гісторыі проста шакіруюць: «Познань, Варшава, Гданьск. Дзе толькі ні спрабавалі. У мяне дачка і сын, 11 і 14 гадоў, плачуць па начах. Ужо трэці дзень дабіцца не магу, што і як. Суседка расказала, што бачыла, як да дачкі прыставалі старэйшыя хлопцы-палякі на школьным двары і спрабавалі «задраць спадніцу». Я вельмі хвалююся, каб не згвалтавалі. Сын прыйшоў з сінякамі на руках. Кажа, што ўпаў на футболе, але я ж бачу, што нехта проста моцна трымаў і ціснуў рукі. У сына на сумцы напісалі фарбай: «З'язджай у сваю краіну, бульбаш».

Цынізм у тым, што дзяцей пры эміграцыі ў Польшчу ніхто ні пра што не пытаўся, падкрэсліў дэпутат Палаты прадстаўнікоў Сяргей Клішэвіч. «Ва ўладзе Польшчы зноў тыя, хто ўспрымае нас як абслугу і крыніцу працоўных рэсурсаў для нізкаплатнай працы. На вялікі жаль, у пастку такой агіднай палітыкі па недамысленні сваіх бацькоў трапілі дзеці, – адзначыў БелТА парламентарый. – Прычым польскаму грамадству сістэмна навязваецца палітыка нянавісці да ўсходніх славянскіх народаў, што прыводзіць да булінгу беларусаў з боку мясцовага насельніцтва. Як вынік мы бачым, да якіх сумных наступстваў гэта прыводзіць. Але гэта нікога не цікавіць у польскім палітычным кіраўніцтве, мы для іх проста расходны матэрыял».

КАРТА НЯНАВІСЦІ

Афіцыйная Варшава свядома разыграе карту нянавісці. «Мы павінны разумець, што цэнтры псіхалагічных аперацый НАТА працуюць не толькі супраць нас, але і супраць насельніцтва Польшчы, краін Балтыі. Яны генерыруюць у іх у свядомасці дух нацыяналізму, які вядзе да нацызму», – заўважыў у эфіры «Альфа Радыё» аналітык Беларускага інстытута стратэгічных даследаванняў Аляксей Аўдонін. У выніку, калі палякі задаюцца пытаннем, хто вінаваты ў пагаршэнні якасці жыцця, яны прыходзяць да высновы, што гэта суседзі, растлумачыў эксперт: «Гэта класічны спосаб барацьбы з сацыяльна-эканамічнымі праблемамі. У Польшчы набірае абароты эканамічны крызіс, пагаршаецца дабрабыт палякаў. Мясцовыя СМІ тлумачаць гэта тым, што туды, у прыватнасці, прыехалі беларусы».

Аналітык БІСД адзначыў, што Польшча ператвараецца ва ўнутраны канцлагер, і гэта небяспечна для беларусаў, якія жывуць на яе тэрыторыі: «Закрываюць пераходы, імкнуцца зрабіць з сябе ўнутраны канцлагер. Тыя, хто не ведае гісторыю, няхай пацікавяцца, да чаго вядзе нацызм: унутры грамадства пачынаюць шукаць ворагаў. Ворагамі будуць бежанцы, мігранты, у тым ліку беларусы. Трэба вяртацца на радзіму, прызнаваць свае памылкі. Тут будзе значна спакайней, лягчэй, чым у Польшчы. Там вы чужыя людзі і нікому не патрэбны».

Мікалай ЛІТВІНАЎ.

80-ГОДДЗЕ ПЕРАМОГІ І НЕ ТОЛЬКІ...

Нацыянальны банк выпусціць у абарачэнне 25 найменняў памятных манет і два найменні памятных банкнот

Як удакладніла прэс-служба рэгулятара, пастановай Праўлення Нацыянальнага банка зацверджаны пералік памятных манет і памятных банкнот, якія плануюцца да выпуску ў абарачэнне ў 2025 годзе.

Памятныя манеты і банкноты плануецца выпусціць у абарачэнне з нагоды святкавання 80-годдзя Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Выпуск памятных манет таксама будзе прысвечаны іншым юбілейным датам: 900-годдзе Полацкага жаночага манастыра і 100-годдзе Бярэзінскага біясфернага запаведніка.

